Тыднёвік Магілёўскі

Тыднёвік Магілёўскі

№ 17 (58) 29 красавіка 1999 г. Кошт свабодны

Поўнасьцю і канчаткова збудаваная стабілізацыя

Гэтымі днямі афіцыйная прэса поўная афіцыйных-жа паведамленьняў пра эканаміна-сацыяльныя вынікі першага квартала (цікаўных адсылаем да дзяржаўных выданьняў І.БТ). Мы са свайго боку, як правіла, старонімся гэтых лічбаў і наогул статыстыкі. Хаця лічбы лічацца самай упартай рэччу, для нас больш пераканаўча гучаць факты штодзённага жыцьця: тое, што бачым, тое, што паведамляюць нам чытачы, тое, з чым сутыкаемся самі. Жыцьцё як яно ёсьць, калі не рабіць над сабой прымусу, абсалютна відавочнае для ўсіх і пераканаўча пярэчыць любым рэляцыям. Яно відавочнае нават для тых-жа статыстыкаў, што падаюць пераможныя (бо іншых улада не прыме) лічбы «наверх». Зразумела, для тых, хто іх зацьвярджае і аддае ў друк. І нават для тых, хто ім як быццам верыць. Вось і атрымліваецца замкнёная кола ілжы і згоды.

У ім жывем ня першы год. Даволі значная колькасьць людзей пераканала сябе ў тым, што гэта і ёсьць стабілізацыя па-беларуску, дзе нават пасьля падвышэньня кошту на гарэлку яна застаецца самым танным прадуктам «харчаваньня». Ці не таму «статыстыка» выглядае, напрыклад, даволі прываблна ў спажывецка-гандлёвым разьдзеле – асабліва там, дзе справаздача тычыцца «товарооборота». Тым часам нам паведамляюць, што самай папулярнай тэмай застольных, сяброўскіх і нават выпадковых суседзкіх сустрэчай становіцца, як у горшыя савецкія часы, тэма прадуктовая: зацікаўлена абмяркоўваецца, дзе і колькі чаго даюць альбо давалі ўчора, каму пашанцавала натрапіць на лаяльную цану, на якім кірмашы і што таньней...

Зьдзіўляцца няма чаму. Даўно абяцаная, аб'яўленая і пацьверджаная статыстыкай стабілізацыя наступіла. Як той сацыялізм: поўнасьцю і канчаткова. А жыць тым ня менш трэба...

Рэдакцыйны Аглядальнік друку і пошты

ПРАКУРОРСКІ РОЗГАЛАС МЯСЦОВЫХ ВЫБАРАЎ

Пошук вінаватых працягваецца

Дзеяньні пракуратуры сьведчаць, што анікога з тых, хто падпісаў Заяву грамадзкіх арганізацыяў, якая была надрукаваная ў «Народнай волі» напярэдадні выбараў у мясцовыя саветы, не абміне пракурорская ўвага. У гэтым дакуменце пракуратура ўгледзела заклік да выбарчага байкоту.

Пачаліся выклікі падпісантаў у пракуратуру Ленінскага і Цэнтральнага раёнаў горада, пакуль, [illegible] размовы [illegible] высьвятленьне гісторыі зьяўленьня канкрэтных магілёўскіх подпісаў пад Заявай, якіх па нашай вобласьці налічваецца 46 чалавек. Выклікаўты папярэджваюцца аб узбуджэньні супраць іх адміністрацыйнай справы (у шэрагу раёнаў вобласьці на гэтую тэму ўжо адбыліся суды, праўда, пакуль безвыніковыя для абвінавачаных). Відаць, улада плянуе зваліць віну за слабую «выбарчую» актыўнасьць насельніцтва на ахвяраў Заявы і разам з тым напалохаць апазіцыю напярэдадні магчымай адбыцца перарэгістрацыі палітычных ды грамадзкіх арганізацый.

Уласная інфармацыя

Нагадаў пра сябе прэзыдэнцкі раён

У дэмакратычным асяродзьдзі вобласьці ўжо нават пасьмейваліся са шклоўскіх выбарчых актывістаў, якім «па знаёмству» усё сыходзіць з рук. Аднак рэпрэсіі дняні дабраліся і сюды. Раённы пракурор Сьмоткоў правёў некалькі асабістых афіцыйных сустрэчаў з рабочым кацельні Аляксандрам Шчарбаком і рабочым мясцовай Сельгасхіміі Юрасём Драздовым. Абодвух пракурор страшчаў «незаконным удзелам у арганізацыі датэрміновых прэзыдэнцкіх выбараў». Спробы суразмоўцаў давесьці наглядчыку за законнасьцю, што 5 – гэта і ёсьць 5, а ніяк ня 7, да ўвагі прынятыя не былі.

Аляксандра Шчарбака нават удалося прывесьці ў суд, праўда, пакуль «за байкот» нядаўніх выбараў у мясцовыя саветы. Ягоны подпіс стаіць пад Заявай шэрагу грамадзкіх арганізацыяў краіны, якая была надрукаваная ў «Народнай Волі» напярэдадні «сьвята свабоднага волевыяўленьня». У гэтым дакуменьце дэмакратычная арганізацыі зьвярнулі ўвагу грамадзкасьці на неадпаведнасьць выбарчага закону і самую арганізацыю выбараў Канстытуцыі і міжнародным дэмакратычным нормам. Такая неадпаведнасьць, на думку падпісантаў Заявы, ёсьць не «адценьнем беларускіх асаблівасьцяў», а перашкодай свабоднага ўдзелу грамадзянаў у свабодных выбарах. Аднак-жа ўсе пракуроры краіны і многія суды практычна аднačасова і аднолькава зьвярнулі сваю ўвагу на гэтую Заяву і пачалі паўсюдна выклікаць «на кавёр» падпісантаў... Што тычыцца прэзыдэнцкага раёна, суд над Шчарбаком адкладзены да атрыманьня з рэдакцыі «НВ» копіі Заявы з уласнаручнымі подпісамі падпісантаў.

Тым часам справа супраць актывіста іншай выбарчай кампаніі Юрася Драздова пакуль яшчэ «сьпее» для суда ці, магчыма, для прыняцьця іншых мераў. Яму, прыкладам, далі зразумець, што ў райцэнтры ня так шмат месцаў, дзе «можна ўладкавацца звольненаму з папярэдняй працы чалавеку».

Уласная інфармацыя

НА АПОШНЯЙ ПРЫСТУПЦЫ

Усё адбудзецца як мае быць

Такую выснову зрабіў падчас учорашняй гутаркі з карэспандэнтам «ТМ» старшыня абласной выбарчай камісіі па выбарах прэзыдэнта, прызначаных Вярхоўным Саветам на 16 траўня, Уладзімер Шарапаў. Пры гэтым ён меў на ўвазе не арганізацыйную альбо якую іншую пратакольную частку «выбарчага мэханізму», а менавіта сам факт іх рэальнага правядзеньня.

Старшыня выбаркаму паведаміў пра тое, што ўтвораны і гатовыя да працы ўсе ўчастковыя камісіі, ёсьць сьпісы выбаршчыкаў, зацьверджаны межы ўчасткаў і г.д. Застаецца адно: абыйсьці людзей па месцы іх жыхарства, паколькі іншага варыянту прадастаўленьня грамадзянам магчымасьці скарыстацца сваімі выбарчымі правамі 16 траўня, на жаль, няма. З гэтай прычыны мяркуецца пайсьці шляхам, які абумоўлены законам, і якім апошнім часам «эфэктыўна» карыстаецца ўлада: датэрміновы пачатак. Дазволенасьць на такі крок асабліва дарэчная для выбараў 16 траўня, бо гэтым разам не грамадзяне пойдуць да выбарчых урнаў, а «зборшчыкі бюлетэняў» завітаюць да іх, каб сабраць галасы альбо зафіксаваць адмову чалавека (што, дарэчы, нічым яму абсалютна не пагражае) ад права прагаласаваць за аднаго з кандыдатаў у прэзыдэнты. Такая рэчаіснасьць, такая сытуацыя, такія ўмовы. Хутчэй за ўсё выбары распачнуцца за тыдзень да аб'яўленага тэрміну.

За гэтым, так бы мовіць, выключэньнем не па сваёй волі, усё гатова для выбараў і будзе рэалізавана... Гэтыя словы можна было б узяць у двукосьсе, бо менавіта зь імі Уладзімер Шарапаў аптымістычна разьвітаўся з вашым карэспандэнтам.

... А праз суткі яго судзілі ў Кіраўску, дзе раней ён быў затрыманы міліцыянтамі і абшуканы. Асаблівых «доказаў» ягонай віны не знайшлі, аднак пратакол склалі і ў суд выклікалі. Судзьдзя таксама адмовілася весьці «палітычную дыскусію» (так яна адрэагавала на просьбу падсуднага патлумачыць яму матывы затрыманьня і сутнасьць зробленага ім парушэньня), а адразу перайшла да справы: 1 млн. рублёў штрафу – самі ведаеце за што!

Генадзь СУДНІК

АДКРЫТАЕ ГРАМАДЗТВА: ПРЭЗЭНТАЦЫЯ ІДЭІ

Ім ня трэба сабе нічога даказваць

На 7-й старонцы «ТМ» прэзэнтуе сёньня маладзевую магілёўскую газэтку «Бадзяга». Нашая дарослая рэдакцыя ніякім чынам не спрычынілася да таго, што вы прачытаеце. Гэтае выданьне, якое дагэтуль існавала, як цяпер гавораць, у віртуальным сьвеце, падрыхтаванае й аформленае самімі хлопцамі, старэйшаму зь якіх ці ёсьць 18 гадоў. Пра многае яны думаюць і разважаюць сур'ёзна. Шмат што робяць з гумарам і нават жартамі над сабой. Але азірніцеся вакол: ці ня праўда, што амаль усё – палітыка, эканоміка, грамадзкае жыцьцё, адукацыя, мараль – выклікаюць калі ня сьлёзы, дык сьмех. Альбо тое й іншае аднначасова... А моладзь здавацца ня хоча. Яна марыць пра сьветлы і вольны дзень сваёй Бацькаўшчыны, рэальна яго набліжае. Хай бы сабе і такой сьціплай справай, як самастойная – незалежная! – газэтка.

Рэдакцыя «ТМ» ахвотна прадаставіла сваю газэтную плошчу для прэзэнтацыі першых творчых спробаў, магчыма, заўтрашніх журналістаў новай краіны.

КРОНІКА ТЫДНЯ Ў ПАДЗЕЯХ І ФАКТАХ

Справаздачны зьезд Таварыства беларускай мовы па просьбе Генадзя Бураўкіна вызваліў яго ад пасады старшыні ТБМ. Новым старшынём зьезд абраў Алега Трусава. Увага грамадзкасьці была прыцягнутая да зьезду яшчэ і тым, што ўпершыню на ім прысутнічалі прадстаўнікі афіцыйнай улады ў асобах намесьніка кіраўніка прэзыдэнцкай Адміністрацыі, старшыні Дзяржкамдруку і міністра адукацыі. Усе трое выступілі. Іхныя прамовы неаднаразова перапыняліся іранічнымі воплескамі аўдыторыі альбо дружным сьмехам. Ніяк інакш рэагаваць на хлусьлівыя і цынічныя прамовы дэлегатам не выпадала.

Свабодныя прафсаюзы, у тым ліку ў Магілёве, прыступілі днямі да новай масавай кампаніі. Гэтым разам перад імі стаіць задача сабраць пад сваёй пэтыцыяй на адрас нацыянальнага сходу (верхняй палаты «парлямэнта») 150 тыс. подпісаў. Без такой колькасьці дэпутаты адмаўляюцца даць прафсаюзам тлумачэньне аб тым, чаму не выконваецца 42-гі артыкул Канстытуцыі, які дэкляруе адказнасьць дзяржавы за «прыстойны ўзровень» заробкаў працуючых людзей. Усе



артыкулы Асноўнага дакумэнта маюць, як вядома, прамое дзеяньне. Незалежныя прафсаюзы падлічылі, што пазначаны артыкул патрабуе, з улікам цаны спажывецкага кошыку і кошту камунальных паслугаў, плаціць за месяц некваліфікаванаму рабочаму як меней 32 млн. руб. «Палата» ў адказ накіравала прафсаюзам ліст, у якім паведаміла, што яна возьме на сябе тлумачэньне толькі калі да гэтай просьбы далучыцца 150 тыс. чалавек.

Эфэктыўную форму зносін з жыхарамі раёна вынайшаў старшыня Слаўгарадзкага райвыканкама сп. Берастаў. У падначаленай яму раённай газэце напярэдадні суботніка надрукаваны Зварот раённага адміністратара да ўсіх жыхароў. Перад гэтым урадавую тэлеграму на гэтую-ж тэму атрымалі самі кіраўнікі «вэртыкалі». Яе і прадубляваў здагадлівы слаўгарадзкі начальнік, дэманструючы не толькі службовую адданасьць, але і ўменьне перакладваць сваю адказнасьць на высокія інстанцыі. Паспрабуй цяпер спытаць зь яго за тое, што людзі дрэнна адгукнуліся на патэтычныя заклікі кіраўніцтва краіны, якія апэратыўна давёў да ведама народа мясцовы адміністратар.

У першым квартале года ў Чавусах за сродкі дзяржавы пабудавалі дзьве кватэры. З такімі тэмпамі будаўніцтва жыльля ў нованароджанага чалавека, калі яго адразу паставяць у чаргу, ёсьць шанец атрымаць кватэру толькі перад пэнсіяй.

Больш за іншых хварэюць дзеці ў Бялыніцкім раёне. Сухая статыстыка паведаміла пра гэта так: на 1.000 дзяцей у раёне хварэе 1.083. Як гэта можа быць, нам зразумець цяжка. Але статыстыка – навука дакладная й таму ведае, што паведамляе.

Дрыбін, як вядома, стаўся пасёлкам перасяленьня чарнобыльскіх пакутнікаў. Райцэнтар меркавалася зрабіць ва ўсіх адносінах узорным, на зайздрасьць нават замежжу. У шасьці навучальных установах тут пабудаваныя – гэта вам не жартачкі – басэйны. Але, відаць таму, што дзеці паводзяць сябе дрэнна (калі памятаеце знакаміты анэкдот), вады ў іх няма.



Увесьці гэтымі днямі на веснавых работах начную зьмену – з такой ініцыятывай выступіў старшыня Быхаўскага райвыканкама сп. Гунёў. Цяжка ўявіць сабе, што можна рабіць у полі ўпрыцемках, але прапанова старшыні прагучала афіцыйна падчас паседжаньня выканкама і знайшла адлюстраваньне ў надрукаванай газэтнай справаздачы.

Палова прамысловых галінаў вобласьці (6 з 13) у першыя тры месяцы года зьнізілі аб'ёмы вытворчасьці. Сярод іх немалая колькасьць харчовых прадпрыемстваў. Некаторыя зь іх загадамі зьверху прымушаныя працаваць сабе на страту, нібы задавальняючы патрэбы насельніцтва. Аднак, такое становішча так ці йнакш праяўляецца: яшчэ нікому не ўдавалася падначаліць эканоміку. Яна альбо ёсьць, альбо – няма. Нават калі гэтую акалічнасьць надоўга схаваць, як гэта было пры савецкай уладзе.

Да ўдзелу ў гуманітарнай дапамозе сэрбскім сябрам спрычыніўся Клімавіцкі завод масла і сухога абястлушчанага малака. Днямі адсюль адгружана 3 тоны сухога малака на адрас Югаслаўскай Фэдэрацыі. Якім чынам дойдзе гэты груз па адрасу і калі – невядома. Добра, што сухое малако можа захоўвацца і не псавацца практычна бясконца.

Інфармацыйная служба «ТМ»

КРОНІКА ТЫДНЯ Ў ПАДЗЕЯХ І ФАКТАХ

ПРЭЗЫДЭНЦКІЯ ВЫБАРЫ. КУЛЬМІНАЦЫЯ

А можа і сапраўды часы ў нас усё тыя-ж...

Кампанія па выбарах прэзыдэнта працягваецца, нягледзячы на шчыраваньне пракуратуры і міліцыі. Пракурорскія сьледчыя, адсунуўшы на задні плян барацьбу з крымінальнай злачыннасьцю, узяліся за допыты сябраў выбарчых камісіяў. Паколькі законных падставаў для выкліку людзей у пракуратуру няма, бо яны ніякага закону не парушылі (што, відаць, разумеюць і ў пракуратуры), робіцца ўсё гэта вульгарна-непрафэсійна: у позвах не называецца прычына выкліку. Пракурорскі прафэсіяналізм праяўляецца ў іншым: выклікаюць не ўсіх, а выбарачна, выбіраючы ня сталых палітыкаў, а тых з шэраговых грамадзянаў, на якіх можна груба «націснуць». Прымушаюць людзей падпісваць нейкія «тлумачэньні» ці пратаколы. Тыя й падпісваюць, думаючы, што калі пракурор патрабуе, то так і трэба рабіць, і ня ведаюць, што маюць права адмаўляцца і ад адказаў на пытаньні, і ад подпісаў, пакуль не прад'яўлена абвінавачваньне.

А гэтае самае абвінавачваньне, калі ўжо так, спачатку трэба было б прад'явіць старшыні (легітымнага, дарэчы) Вярхоўнага Савета Сямёну Шарэцкаму, а тое і ўсяму ВС, якія прынялі рашэньне аб прэзыдэнцкіх выбарах і прызначылі іх на дакладны (строга па Канстытуцыі) час. На гэта пракуратура пакуль не адважваецца, але хутчэй за ўсё – проста чакае каманды.

Ну, а на месцах ідзе паляваньне на людзей. Мы валодаем дзьвюма дакумэнтамі на гэты конт. Яны вартыя абнародаваньня. Напачатку прачытайце вось гэты ліст з Бабруйска (друкуем на мове арыгіналу).

«Сегодня, 13.04.1999 г. в 5 часов 50 минут утра работниками милиции г.Бобруйска было совершено нападение на моё частное домовладение. Причиной вторжения послужило то, что три члена моей семьи состоят в комиссиях (областной, городской и районной) по выборам Президента Республики Беларусь.

Мощным стуком в калитку (казалось, что рухнет крыша дома) была поднята с постели на ноги вся семья. Поломав калитку, во дворе дома оказались три милиционера: майор, лейтенант и сержант. Все в форме и при оружии. Рядом с домом стояла милицейская машина с номером 01712-ТВ (газик).

На мою просьбу предъявить удостоверения личности, сотрудники УВД предъявили постановление без печати о принудительном приводе моего сына в качестве свидетеля по уголовному делу Гончаря В.И. Постановление я положила в карман халата. Они потребовали его вернуть. Я отказалась. Тогда майор УВД заломал мне правую руку, причинив телесные повреждения. Сержант милиции закричал: «Что с ней церемониться? Вызывай по рации бригаду скорой помощи с санитарами, и отвезём её в психушку!» и бросился на помощь майору тащить меня за руки в милицейскую машину. Я вырвалась, вбежала в дом и закрылась на замок. Они продолжали ломиться в дверь дома и в окно.

Уходя, сержант пригрозил: «Сейчас вызовем подкрепление милиции, бригаду скорой помощи с санитарами, взломаем дверь и отвезём всех вас в психушку».

Так что психушки 80-х годов, в которые помещали неугодных коммунистическому режиму людей, в скором времени могут заработать на полную мощь в Беларуси.

Мне этот случай напомнил 1929, 1930, 1937, 1938, 1944 годы, когда вот так бесцеремонно палачи-инквизиторы из НКВД врывались по ночам в дома моих родных по линии мамы и моих родителей. Пытали на допросах, садили в одиночки, гнали по этапу на Соловки и Колыму, расстреливали, уничтожали. 70 человек из семьи Говоровских прошли по этапам вместе с малолетними детьми, 30 из них были расстреляны или замучены. Отец скончался под пытками. 5 маминых братьев были забраны в 1937 году в одну ночь и не вернулись. В 5 лет оставшись сиротой, я воспитывалась в детских домах, начиная с приёмника-распределителя НКВД.

Прошу довести этот вопиющий факт беззакония, издевательства и попрания прав человека до мировой общественности через любые СМИ и правозащитные организации.

Прошу также оказать содействие по защите и безопасности моей семьи. Правозащитной деятельностью занимаюсь с 1985 года. Сотни людей благодаря моему труду получили справки о реабилитации, восстановили доброе имя. При нашей организации открыт первый в СНГ музей жертв политических репрессий и создана библиотека по правам человека. 17 июля 1999 года исполняется 10 лет Бобруйской организации жертв политических репрессий, осуществляющей правовую защиту и помощь жертвам сталинизма.

Постановление о принудительном приводе моего сына прилагаю.

Анна БОКАЧ,
Член Правления Международной федерации,
член Совета и Правления Белорусской ассоциации жертв политических репрессий, председатель её Бобруйской организации»

А вось дакумэнт другі (таксама – арыгінал)

«Постановление
о приводе свидетеля
12.04.1999 г.

Следователь СО Ленинского РОВД г.Бобруйска л-т милиции Сикорский Г.М., рассмотрев материалы уголовного дела № 110095, установил:

СУ ГУВД Мингорисполкома расследует уголовное дело № 110095 по ст.190 УК РБ в отношении Гончара В.И.

СУ ГУВД Мингорисполкома в порядке ст.127 УПК РБ поручило СО Ленинского РОВД г.Бобруйска проведение следственных действий по делу, в частности допрос свидетеля Бокач Э.Р.

Бокач Э.Р. был уведомлён повесткой о явке в СО Ленинского РОВД к 10.00 ч. 7.04.1999 г. Однако по повестке не явился и не уведомил о причине неявки.

Руководствуясь ст.67 ч.2 УПК РБ,

Постановил:

1. Подвергнуть приводу в Ленинский РОВД г.Бобруйска Бокач Эдуарда Рыгоравича, проживающего г.Бобруйск, ул.Р.Люксембург, 106. 13.04.1999 г. к 10.00 ч.

Следователь СО Ленинского РОВД г.Бобруйска
л-т милиции Сикорский»

На гэтай паперцы ў верхнім кутку «віза»: т.Паркин Т. Осуществить привод 13.04.99 к 8.00. *(подпіс неразборлівы).*

... Успамінаецца анэкдот: – Да двух міліцыянтаў на вуліцы падыходзіць турыст і пытаецца на ангельскай мове, як знайсьці гатэль. Яны не разумеюць. Турыст паўтарае сваё пытаньне на францускай мове. Вынік той-жа. Ён пытаецца на гішпанскай, нямецкай... Міліцыянты не разумеюць. Турыст адыходзіць. «Трэ было вывучыць хаця б адну замежную мову, – кажа адзін міліцыянт другому, – а то няёмка неяк. – «А навошта? – пярэчыць той. – Вось гэты аж чатыры мовы ведае, а нічога не дабіўся!»

Можна было б дараваць л-ту Сікорскаму, што ён ня ведае, як па-расейску гучыць імя Рыгор, калі б гэта не было зьвязана з важкай юрыдычнай акалічнасьцю. Калі позва л-та напісана па-расейску, то яна павінна быць адрасавана Бокачу Эдуарду Григорьевичу. Калі ж выклікаюць Бокача Э.Р., то якія прэтэнзіі да Бокача Э.Г. за «неяўку»?

Зразумела, што гэта «дробязная» юрыдычная недарэчнасьць, хаця нідзе ў сьвеце дробязяў, калі вырашаецца юрыдычны лёс чалавека, – няма! Такім чынам, вучыцца дзейнічаць у дакладнай адпаведнасьці з законамі трэба спачатку тым, хто стаіць на ахове гэтых самых законаў. Аднак, пэўна, гэта значна складаней, чым зламаць калітку, закруціць чалавеку рукі, брудна вылаяцца і пагразіць «псыхушкай». Але-ж інакш нельга. Ня тыя часы, шаноўныя. Хаця, хто ведае, якія зараз у нас часы...

М.БУЛАВАЦКІ

У прадчуваньні новага этапу

На мінулым тыдні старшыня Беларускага Праваабарончага Цэнтру «Вясна-96» Алесь Бяляцкі зрабіў рабочую паездку па шэрагу гарадоў краіны, дзе дзейнічаюць 14 філіяў гэтай грамадзкай арганізацыі. Мэтай яе было знаёмства на месцах з працай актывістаў праваабарончых арганізацыяў, якія ў апошнія гады сталіся неад'емным фрагмэнтам сацыяльна-палітычнага жыцьця краіны, а таксама наладжваньне больш апэратыўнай сувязі паміж маніторынгавымі карэспандэнтамі Цэнтру.

У чацьвер ён меў сустрэчу з дэмакратычным актывам Магілёва. На ёй Алесь Бяляцкі праінфармаваў прысутных аб сытуацыі з правамі чалавека ў нашай краіне, як яе бачыць і, дарэчы, адчувае на сабе «Вясна-96». У прыватнасьці, маніторынгам Цэнтру летась было зарэгістравана толькі ў Менску больш за 300 выпадкаў міліцэйскага, адміністратыўнага і судовага перасьледу людзей за іх палітычныя перакананьні і змаганьне за свае правы, між іншым, гарантаваныя Канстытуцыяй і законамі, а таксама міжнароднымі пагадненьнямі, якія падпісаныя і Беларусьсю. Аднак, як паведаміў сп. Бяляцкі, «сілавыя» ведамствы і нават суды кіруюцца ў нас не законамі, а загадамі органаў улады. Апошні яскравы прыклад – нядаўні суд у Воршы над актывістам дэмакратычнага рабочага руху Сяргеем Антончыкам. На просьбу рабочых мясцовага завода ён удзельнічаў там у сустрэчы. Быў затрыманы, а пазьней прыцягнуты да суду па абвінавачваньні ў «несанкцыянаванасьці» мерапрыемства. На судзе не знайшлося ніводнага сьведкі, які б пацьвердзіў абвінавачваньне. Ад «сваіх» ранейшых прэтэнзіяў да Сяргея Антончыка адмовілася адміністрацыя завода. Аднак суд прызнаў чалавека вінаватым, бо прозьвішча Сяргея Антончыка даўно рэжа слых службоўцам і памагатым рэжыму. Такая практыка набывае ўсё больш звычайны характар.

Падчас сустрэчы Алеся Бяляцкага з праваабаронцамі і актывістамі дэмакратычных партыяў адбылася гаворка й на тэму прэзыдэнцкай выбарчай кампаніі. У гэтай сувязі сп. Алесь паведаміў, што аўтарытэтная міжнародная праваабарончая арганізацыя Amnesty International апошнім па часе рашэньнем прызнала вязьнем сумленьня Міхаіла Чыгіра, афіцыйнага кандыдата ў прэзыдэнты Беларусі. Наданьне чалавеку такога статусу выклікае шматбаковыя меры міжнароднага ўзьдзеяньня на кіраўніцтва краіны, чым грамадзянінам ёсьць такі вязень. Гэта не заўсёды прыводзіць да вызваленьня чалавека, аднак рэакцыя кіраўніцтва краіны на звароты і просьбы арганізацыі ніколі не пакідаецца па-за ўвагай цывілізаваных дзяржаваў. Гэта важкі момант, як і тое, што ў беларускіх выбарах трэба дайсьці да лягічнага іх завяршэньня. Пасьля 20 ліпеня, афіцыйнага скасаваньня тэрміну знаходжаньня на пасадзе прэзыдэнта, каб не дапусьціць да непажаданага разьвіцьця падзеяў у нашай краіне, сьвет мусіць адэкватна ўспрымаць і рэагаваць на сытуацыю ў Беларусі, да якой зараз ставіцца даволі лагодна.

Зараз пад увагай «Вясны-96» і цэлагу міжнародных праваабарончых арганізацыяў яшчэ дзьве новыя беларускія справы: крымінальныя абвінавачваньні, высунутыя намесьніку старшыні Маладога Фронту Яўгену Скочку і старшыні Гомельскай абласной выбарчай камісіі па выбарах прэзыдэнта РБ 16 траўня Яўгену Мурашку. Упершыню ім імкрымінуецца артыкул, па якому можна прысудзіць да трох і болей гадоў турмы (праваабаронцы мяркуюць па гэтым факце аб магчымым наступе чарговага, больш жорсткага, этапу барацьбы рэжыму з іншадумствам). Маладога хлопца хочуць пасадзіць за «несанкцыянаванае» шэсьце (нагадаем, што гаворка ідзе пра наведаньне групай менскай моладзі падчас міжнароднага Дня сьвятога Валянціна шэрагу замежных амбасадаў), а кіраўніка выбарчай кампаніі – нібыта за «прысваеньне» службовых паўнамоцтваў.

Алесь Бяляцкі ў вузкім коле магілёўскіх паплечнікаў пракансультаваў іх і па канкрэтных, практычных момантах работы «Вясны-96».

Генадзь СУДНІК

У мінулую нядзелю на хвалях Беларускай службы радыё Свабода прагучала адмысловая праграма, поўнасьцю прысьвечаная адказам на пытаньні слухачоў афіцыйна зарэгістраваных кандыдатаў у прэзыдэнты Беларусі. Зянон Пазьняк адказваў на пытаньні асабіста, а Міхаіла Чыгіра, які знаходзіцца за кратамі, прадстаўлялі ягоная жонка й паплечніца Юлія Чыгір і намесьнік старшыні БСДП «Народная Грамада» Аляксей Кароль. Прапануем чытачам скарочаны варыянт гэтай праграмы.







РАДЫЁ СВАБОДА
BELARUS SERVICE RFE/RL

Лукашэнкам – будзе пастаўлена. Яго паставіць народ, людзі, якія пацярпелі. Вельмі шмат зрабіў парушэньняў і вельмі шмат шкоды нанёс Беларускай нацыі й дзяржаве А.Лукашэнка. Таму можна не сумнявацца, што гэтае пытаньне ўзьнікне і хутчэй за ўсё справа да суда дойдзе.

ўвойдуць у кіраўнічыя структуры і ва ўрад. Акрамя таго, увойдуць дэпутаты апазыцыі ВС 12 склíканьня. Усе яны – вядомыя спэцыялісты ў галінах эканомікі, палітыкі, навукі... Ёсьць некалькі кандыдатур на прэм'ера. Магу сказаць, што ім будзе неабавязкова эканаміст. Гэты

На хвалях Свабоды інача й нельга. Толькі – адкрыта, дыскусійна і шчыра...

Пытаньне. Ці маеце Вы маральнае права балятавацца на пасаду прэзыдэнта?

Юлія Чыгір: – Хачу падкрэсьліць, што муж сышоў у адстаўку да рэфэрэндуму 1996 г. Калі ён пісаў заяву аб адстаўцы, умовай свайго магчымага няўходу ён паставіў адмену рэфэрэндума. Ён сышоў ня ціха, непрыкметна, а – са скандалам, і я лічу (і ня толькі я), што ягоная адстаўка была адной з прычынаў, чаму не прызналі вынікі рэфэрэндума цывілізаваныя краіны. Ён адзін выступіў за месяц да правядзеньня супраць рэфэрэндума, ён адзін не выступаў па загаду прэзыдэнта па БТ з агітацыяй за рэфэрэндум. Ён вычарпаў усе свае магчымасьці спыніць гэты рэфэрэндум, знаходзячыся на пасадзе, таму ня моўчкі, а са скандалам сышоў з пасады.

Зянон Пазьняк: – Адносна права балятавацца. Я ўсьведамляю ня толькі маральнае, юрыдычнае й палітычнае права, але і абавязак рабіць менавіта так, а ня йнакш у гэтай сытуацыі. Наконт вяртаньня. Я магу вярнуцца ў любы час, калі палічу гэта палітычна неабходным.

Пытаньне. Калі адбудуцца выбары (і ці адбудуцца?), як кандыдаты плянуюць браць рэальную ўладу?

Аляксей Кароль: – Безумоўна, правесьці выбары строга па канонах Канстытуцыі 1994 г. відавочна не ўдалося. Па той прычыне, што ўлада рабіла перашкоды: выклікі, арышты; каля 1.000 чалавек падвергнутыя таму ці іншаму ціску ў сувязі з выбарчай кампаніяй. Тым ня менш, настрой людзкі памянуўся: людзі гатовыя прагаласаваць, яны хочуць дэмакратычных зьменаў. У гэтым сэнсе кампанія ўдалася. Мэханізм перадачы ўлады, як гэта запісана ў праграме Чыгіра – на працягу месяца ён бы ініцыяваў свабодныя выбары Вярхоўнага Савету. І адноўлены ВС ужо прымаў бы патрэбныя рашэньні, праводзіў пераразьмеркаваньне функцыяў улады. Паўнамоцтвы прэзыдэнта зьменшыліся б, астатнія паўнамоцтвы былі б разьмеркаваныя, як таго патрабуюць дэмакратычныя стасункі. І яшчэ. 20 ліпеня прэзыдэнт страчвае сваю легітымнасьць. У тым выпадку, калі выбары будуць мець вялікае палітычнае значэньне, але ня будуць мець рэальнага выніку – пераходу ўлады да новаабранага прэзыдэнта – становішча будзе залежыць ад актыўных дзеяньняў апазыцыі, ад падтрымкі яе насельніцтвам, і ад падтрымкі дэмакратычных пераўтварэньняў у Беларусі міжнароднай супольнасьцю.

Зянон Пазьняк: – Адносна падзеяў пасьля 16 траўня. Ёсьць некалькі варыянтаў. Самы верагодны – што выбары будуць забароненыя. У гэтай сытуацыі вельмі істотна, каб выбары былі цалкам адпаведныя Канстытуцыі й закону. Таму што тады забаронамі яны не спыняюцца. Тады яны могуць мець працяг, могуць стаць палітычным працэсам. Таму мэханізм выбараў павінен быць толькі законным. Пасьля 20 ліпеня Лукашэнка страчвае законнасьць улады, і тады выбары могуць быць паўтораныя, пры любой сытуацыі абвастрэньня.

Пытаньне. Якія эканамічныя шляхі вы бачыце па выхаду краіны з крызысу?

Аляксей Кароль: – Праграма распрацаваная Нацыянальным Выканаўчым Камітэтам пры Вярхоўным Савеце, сябрам якога Чыгір зьяўляецца. Аднак існуе прыярытэт палітыкі над эканомікай. Таму на першым пляне – палітычныя дэмакратычныя рэформы, а потым ужо дэмакратычныя ўлады праводзяць шэраг эканамічных рашэньняў. Нашая праграма спрацуе таму, што яна сыходзіць з інтарэсаў людзей. Эканамічныя рэформы зараз будзе праводзіць значна цяжэй, чым 10 год таму. Цярпеньня ў людзей замала. Але давер да новай улады дазволіць распачаць эканамічныя рэформы. Падзеньне ўзроўню жыцьця, якое заўсёды суправаджае пачатак рэформаў, кампэнсуецца стварэньнем умоваў для разьвіцьця малога і сярэдняга бізнэсу – гэта шмат працоўных месцаў. Давер з боку Захаду дазволіць паявіліцца інвэстыцыі ў эканоміку – гэта таксама зьменшыць наступствы рэформаў для насельніцтва. І потым – свабоднае разьвіцьцё эканомікі дасьць свой станоўчы вынік праз гады, а ці дазволіць праводзіць ужо поўнамаштабныя дэмакратычныя пераўтварэньні ў Беларусі.

Зянон Пазьняк: – Дзяржава не павінна ўмешвацца ні ў чыю дзейнасьць. Яна павінна забясьпечваць людзкую дзейнасьць шляхам дзеяньня законаў. Я лічу вельмі важным пытаньне аб крэдыту даверу і аб тым, што для гэтага трэба рабіць. Перш за ўсё будзе дадзена поўная свабода для прадпрымальніцкай індывідуальнай дзейнасьці, будуць зьнятыя непамерныя падаткі, адменена ліцэнзаваньне на віды эканамічнай дзейнасьці, уведзены заяўляльны прынцып рэгістрацыі прадпрымальніцкай справы, упарадкаваная фінансавая сыстэма краіны – уведзены адзін курс грошай. Будуць ліквідаваныя мафіёзныя дачыненьні, пазабюджэтныя фонды, тайныя бюджэты й г.д. Вельмі істотна зразумець, што пасьля ліквідацыі дыктатуры і адмены ўсяго існуючага паранайдальнага маразму горай ужо ня будзе. Стане лепш. У псыхалягічным сэнсе новая ўлада будзе ў выгаднейшым становішчы. І давер узьнікне адразу-ж, – праз пару месяцаў. Я ўпэўнены, што такая праграма спрацуе, бо яна спрацоўвала ва ўсіх краінах, дзе народныя сілы змагаліся за волю, культуру і дабрабыт.

Пытаньне. Якую кампэнсацыю атрымаюць пацярпелыя ад рэжыму? Якую адказнасьць панясуць тыя, хто зьдзейсьніў злачынствы, знаходзячыся пры ўладзе?

Зянон Пазьняк: – На мой погляд, будзе праведзеная амністыя й скасаваныя крымінальныя справы па палітычных і эканамічных пытаньнях, якія былі ўзбуджаныя дзяржаўнымі органамі. Будуць перагледжаныя ў судах справы эканамічнага й маёмаснага характару з мэтай выяўленьня несправядлівага асуджаных. Ім будзе выплачаная грашовая кампэнсацыя й вернутая канфіскаваная маёмасьць. Наконт сродкаў. Яны будуць узятыя з Фонда прэзыдэнта, які будзе ліквідаваны, з пазабюджэтных фондаў, з аукцыённага продажу фірмаў, утвораных пры Упраўленьні справамі прэзыдэнта ды інш. Гэтыя сродкі будуць пераведзеныя ў бюджэт, а адтуль разьмеркаваныя ў пэнсійны фонд, на кампэнсацыю несправядліва асуджаным і г.д. Да адказнасьці будуць прыцягнутыя людзі, што парушылі заканадаўства.

Пытаньне. Які лёс чакае цяперашняга прэзыдэнта, калі да ўлады прыйдзе хто з кандыдатаў?

Зянон Пазьняк: – Сытуацыя складваецца такая, што незалежна ад волі будучых прэзыдэнтаў гэтае пытаньне – аб судзе над

Юлія Чыгір: – Поўнасьцю падтрымліваю Зянона Пазьняка і спадзяюся, і упэўненая, што Лукашэнка адкажа за ўсе злачынствы – як фінансавыя, так і супраць чалавецтва і свайго народу, якія ён зьдзейсьніў. Я ведаю, што Міхаіл Чыгір стаіць на той пазыцыі, што павінен быць прыняты закон аб люстрацыі і ўсе чыноўнікі, якія парушалі закон, правы чалавека, будуць прыцягнутыя да адказнасьці і адлучаныя ад сваіх пастоў.

Зянон Пазьняк: – Тым больш, будзе ўлічаны вопыт Польшчы й Чэхіі. У сваёй праграме, гаворачы пра люстрацыю, раней БНФ меў на ўвазе менавіта былых партыйных функцыянэраў. Цяпер гэты пункт будзе ўдакладняцца (зараз ідзе дыскусія) і будзе новы пункт – люстрацыя тых людзей, якія супрацоўнічалі з КГБ. Наогул, люстрацыя тычыцца толькі тых, хто працуе (- ваў) ў сыстэме ўлады, тых, хто можа ўплываць на новую ўладу, выкарыстоўваючы свае ранейшыя сувязі. Калі чалавек ідзе на працу ў сыстэму ўраду, ён павінен здаць засьведчаньне – ці не супрацоўнічаў ён з адпаведнымі службамі. А калі гэтага ня будзе зроблена, і праверка выявіць, што – так, супрацоўнічаў – ён ня будзе дапушчаны да працы ў дзяржаўных установах. Улада павінна быць чыстая.

Аляксей Кароль: – Чынавенства не зьяўляецца палітыкамі. На вышэйшым узроўні, сапраўды, людзі павінны быць чыстыя. Гэты тычыцца вышэйшага чынавенства.

Пытаньне. Хто будзе зьдзяйсьняць новыя беларускія рэформы ў вашых камандах?

Юлія Чыгір: – Нашая каманда налічвае больш за 2.000 чалавек. Гэта людзі, што ўвайшлі ў ініцыятыўныя групы і ў групы падтрымкі Чыгіра. Сярод іх ёсьць чыноўнікі, прамыслоўцы, прадстаўнікі сельскай улады, сябры шэрагу палітычных партыяў, нават БНФ. Пытаньне аб тым, хто якую пасаду зойме, пакуль не вырашалася. Чыгір лічыць, што Вярхоўны Савет будзе вырашаць – калегіяльна – пытаньне аб прэм'ер-міністры. Пэрсанальна нікога пакуль не разглядвалі.

Зянон Пазьняк: – Ценявы кабінэт Фронту існуе дагэтуль, яшчэ ад часу папярэдніх прэзыдэнцкіх выбараў. Ён працуе ўвесь час: напрацоўвае праграмы першачарговых дзеяньняў. Гэтыя людзі стэрэатып мы, хутчэй за ўсё, паламаем, і ім будзе нечаканы чалавек. Цяпер я не буду яго аб'яўляць.

Пытаньне. Якая мова і якая сымболіка будуць дзяржаўнымі, калі вы станеце прэзыдэнтам?

Юлія Чыгір: – Чыгір быў супраць і першага рэфэрэндума, калі абмяркоўваліся пытаньні беларускай сымболікі, лічыў, што гэта ні да чаго добрага не давядзе. І сапраўды гэта ўнесла раскол у грамадзтва. Цяпер, канешне, у яго праграме напісана, што адзінай дзяржаўнай моваю павінна быць беларуская. Таксама ён лічыць, што павінны быць вернутыя тыя сымбалі, якія адпавядаюць беларускай нацыі й рэспубліцы. Аднак ён лічыць, што трэба будзе ажыцьцявіць гэтую зьмену (пераход) да «новых» сымбаляў і мовы не гвалтоўна, раптам, а плаўна (пераходны парыяд). Адначасова будуць выкарыстоўвацца два сьцягі й два гэрбы – да першага паседжаньня новаабранага парляманту.

Зянон Пазьняк: – Пытаньне аб мове (згодна закону аб рэфэрэндуме) ня можа ставіцца на рэфэрэндум. Гэта – фундамэнтальная праўная норма, якую груба паламаў Лукашэнка. Улічваючы катастрафічныя вынікі яго антызаконнага дзеяньня ў гэтай частцы парушэньня, ён павінен быць прыцягнуты да адказнасьці. Што датычыць вынікаў рэфэрэндуму, то яны будуць адмененыя таму, што рэфэрэндум 1995 г. быў незаконным і маніпуляцыйным, з грубымі парушэньнямі, з прымяненьнем войскаў у парлямэнце супраць дэпутатаў. Вынікі яго будуць адмененыя Вярхоўным Саветам і Канстытуцыйным Судом. Яшчэ можна дадаць, што пытаньне аб мове ўвогуле не дыскусійнае, таму што будзе вернутае дзеяньне Канстытуцыі 1994 г. Там усё запісана. Што тычыцца меркаваньня тых выбаршчыкаў, якія выказаліся на тым рэфэрэндуме за існаваньне расейскае мовы як дзяржаўнай, – іх інтарэсы будуць улічаныя той-жа Канстытуцыяй 1994 г. (яны ўжо былі там улічаныя), па ёй расейская мова мае ўжытак як мова афіцыйных зносінаў.

Працяг у наступным нумары

Праграма тэлебачаньня з 3 мая па 9 мая

Понедельник, 3 мая

Праграму тэлеканалаў мы друкуем на замову чытачоў. Гаспадары праграмы падаюць нам яе на расейскай. Рэдакцыя фізічна (па часе) не паспявае яе перакласьці. Просім разглядаць гэтыя старонкі як тэхнічна-службовы матэрыял, які ня мае дачыненьня да зьместу й характару нашай газэты.

БТ

6.30, 7.10 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.15 Новости.
8.15 Резонанс.
9.10 Потребительская корзина.
9.25 Телебарометр.
9.40 "Сегодня с вами..."
10.10 Здоровье.
10.35 Мультфильм.
11.10 Новые имена.
11.20 "Ветер в спину". Телесериал.
12.05 Теленавигатор.
12.25 Музыка без границ.
13.15 "Примите телеграмму в долг". Худ.фильм ("Беларусьфильм").
14.35 "Тебе поем". Док. фильм.
15.15 "Чародей-2. Страна Великого Дракона".
15.45 "Дьяконовы". Телеочерк.
16.05 ТВ — школе.
16.25 Поэтические новеллы. "Дорогами войны". Часть 1-я.
16.35 Авто-парк.
16.45 Премьера песни.
17.10 "А музыка звучит..."
17.40 "Расти, мальчик, расти". Док. фильм БТ.
18.05 "Ветер в спину". Телесериал.
18.50 Новые имена.
19.15 Политические диалоги.
19.40 Спортивные новости.
20.00 Добрый вечер, Беларусь!
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 "Дыхание грозы". Худ.фильм по "Полесской хронике" И.Мележа. 1-я серия ("Беларусьфильм").
23.20 Криминальная хроника.
23.25 Белорусский хит-парад.
23.30 Футбол. Чемпионат Беларуси. "Торпедо"- МАЗ"(Минск) — "Днепр-Трансмаш"(Могилев). 2-й тайм.
0.25 Третий тайм.

ОРТ

6.55 Худ. фильм "Узник замка Иф". Фильм 1-й. 2-я серия.
8.00 Мультфильмы.
8.45 Домашняя библиотека.
9.00, 14.00 Новости.
9.15 Пока все дома.
9.50 "Старые песни о главном - 1".
11.30 "Ералаш".
11.55 "Старые песни о главном - 2".
14.15 Умницы и умники.
14.50 "Старые песни о главном - 3".
17.20 Клуб "Белый попугай".
18.05 Ю.Бриннер в фильме "Возвращение великолепной семерки".
19.45 "Спокойной ночи, малыши!"
20.00 Время.
20.35 Филипп Киркоров: "Лучшее, любимое, только для Вас!"
23.00 М.Рурк в триллере "Выход в красное".

"РОССИЯ"

7.00 Мультфильмы.
7.30 Служу Отечеству.
8.00 Сельские вести.
8.30 Почта РТР.
9.00 Доброе утро, страна.
9.30 "Устами младенца". Телеигра.
10.00 "Аншлаг" представляет.
10.30 "Городок".
11.00 Любовь с первого взгляда.
11.25 Домашние хлопоты.
11.55 "Тайна Сахары" (Италия).
13.00 Вести.
13.30 Федерация.
14.10 Парламентский час.
15.10 "Закон и порядок".
16.05 Диалоги о животных.
17.00 Совершенно секретно.
18.00 Старая квартира. Год 1984-й.
19.00 Вести.
19.35 Любовь с первого взгляда.
20.10 Музыкальный ринг.
21.50 Акуна матата.
22.50 Детектив "Взгляд сквозь туннель" (Австралия).

"КУЛЬТУРА"

9.40 "4:0 в пользу Танечки". Худ. фильм.
10.35 "Не надо оваций!" Е.Весник.
11.30, 13.30, 21.00 Новости культуры.
11.40 Е.Носов. "Шопен. Соната номер два". Телевизионный спектакль.
13.00 Вижу цель!
13.29 Азбука.
13.45 "К Амалии". Романсы на стихи А.С.Пушкина.
14.00 "Я вспоминаю... Евгений Габрилович. Последнее интервью". Док. фильм.
15.10 "Большой хоровой собор у стен Храма Христа Спасителя". Патриотический концерт.
15.55 "Там, на неведомых дорожках..."
16.50 "Георгий Владимов и его генералы".
17.30 Новости.
17.35 IV церемония вручения премии К.С.Станиславского.
18.35 Королевский Эллингтон.
19.35 Чудо-сказка.
19.55 Мультфильм.
20.10 "Машина моды". Док. фильм (Франция). Часть 1-я.
20.59 Азбука.
21.20 "Из концертного зала". "Орни-99" с Ириной Архиповой.
22.00 "Путь на восток". Худ. фильм (США). 1-я часть.

НТВ

7.00, 11.00, 15.00 Сегодня.
7.10 Комедия "Веселые ребята".
8.40 "Фитиль".
9.00 Сегодня.
9.20 Вчера в "Итогах".
10.15 Мир кино. "Солдаты удачи".
11.30 Б.Стрейзанд и К.Кристофферсон в музыкальном фильме "Звезда родилась" (США).
13.50 "Жизнь замечательных зверей".
14.25 "Русский век". Вячеслав Котеночкин.
15.30 "Семнадцать мгновений весны".

"МОГИЛЕВ-1" на БТ

13.15 Пунктир.
13.45 Телелоцман.
14.05 Мультфильм.

"МОГИЛЕВ-1"

17.30 "Школьный учитель". Сериал.
18.20 "Бобры идут по следу". Мультфильм.
18.40 Бобруйский вариант.
19.00 Тяжелый день.
19.30 Праздник в вашем доме.
20.20 Телемагазин.
20.30 День области.
20.50 Астро-дайджест.
21.00 Праздник в вашем доме.
21.35 "Крепость". Худ.фильм.
23.05 День области.
23.15 "Презумпция невиновности". Детектив.

2 КАНАЛ

18.00 "Дерзкие и красивые". Телесериал.
18.30 Городские новости.
18.40 "Союзмультфильму — 60".
18.57, 20.40 Прогноз погоды.
19.00 "Белый попугай".
19.25 "Поздравления".
20.30 "В гостях у бабки Агапки".
20.43 Док. фильм.
21.10 Высокая мода.
21.30 Городские новости.
21.40 "Канзас-Сити". Худ. фильм.
23.30 Спортивная программа.

Вторник, 4 мая

БТ

6.30, 7.10 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.05 Новости.
8.15 Политические диалоги.
8.40 Потребительская корзина.
9.15 ТВ — школе.
9.35 Мультфильм.
9.50 "На волне взаимопонимания".
10.30 "Сегодня с вами..."
11.10 Новые имена.
11.20 "Ветер в спину".
12.05 Третий тайм.
12.35 "А музыка звучит..."
13.15 Ко Дню Великой Победы. П.Панченко. "Земле еще болит". Телеспектакль.
14.05 Туробъектив.
14.25 Бездельник.
15.15 "Чародей-2. Страна Великого Дракона".
15.40 Видеокурс английского языка.
16.05 ТВ — школе.
16.30 Сельчане.
16.50 Поэтические новеллы. "Дорогами войны". Часть 2-я.
17.10 Уроки Натальи Новожиловой.
17.35 Гости в дом.
18.05 "Ветер в спину".
18.50 Новые имена.
19.15 "Алло, "Событие".
19.55 Добрый вечер, Беларусь!
20.20 Панорама.
20.55 Хоккей. Чемпионат мира. Беларусь — Финляндия. Трансляция из Норвегии. В перерывах: (21.40) — Событие; (22.35) — Криминальная хроника. Белорусский хит-парад.
23.35 Музыкальный салон. Гость программы — Нани Брегвадзе.

ОРТ

6.55 "Узник замка Иф". Фильм 2-й.
8.30 "Дисней-клуб": "Русалочка".
9.00, 14.00 Новости.
9.15 Пока все дома.
9.55 "Все путешествия команды Кусто".
10.45 Звездный час.
11.25 Крестьянские ведомости.
11.55 Премьера приключенческого фильма "Освободите Вилли-3".
13.25 Смехопанорама.
14.15 Клуб путешественников.
15.05 Футбольное обозрение.
15.35 "Дисней-клуб": "Тимон и Пумба".
15.55 "Дисней-клуб": "Аладдин".
16.30 "Колесо истории".
17.15 Песня-99.
18.00 П.Ришар в комедии "Не упускай из виду".
19.45 "Спокойной ночи, малыши!"
20.00 Время.
20.35 М.Гибсон в боевике "Безумный Макс-2. Воин дорог".
22.15 Хоккей. Чемпионат мира. Сборная России — сборная Украины.

"РОССИЯ"

7.00 "Три орешка для Золушки". Фильм для детей (Чехословакия).
8.30 Мультфильмы.
9.00 "Самый счастливый день". Худ. фильм для детей (Великобритания).
9.20 Концерт, посвященный Дню милиции.
12.00 "Тайна Сахары" (Италия).
13.00, 19.00 Вести.
13.30 "Дела семейные". Вечер, посвященный жизни и творчеству актерской семьи — Марии и Андрея Мироновых, Александра Менакера.
14.55 "Закон и порядок".
15.45 Спортивные танцы на РТР.
16.45 Моя семья.
17.45 "35 лет вместе". Юбилейный вечер Аллы Иошпе и Стахана Рахимова.
19.35 "Аншлаг" представляет.
20.10 С.Юрский и В.Винокур в кинокомедии "Пистолет с глушителем".
21.40 Урмас Отт с...
22.45 Детектив "По следам Янтарной комнаты" (Германия).

"КУЛЬТУРА"

9.10 "О тех, кого помним и любим..." Б.Бабочкин.
10.10 "Мы журналисты. Не стреляйте!" Док. фильм.
11.25 Живое дерево ремесел.
11.30, 13.30, 21.00 Новости культуры.
11.40 Денис Давыдов.
12.00 Несуществующие храмы Петербурга.
12.25 Творческий вечер Ф.Чеханкова.
13.05 Этюды на тему Параджанова.
13.45 Новое кино.
14.10 В.Кондратьев. "Сретенка... Встречи". Телевизионный спектакль.
15.25 Музыкальное приношение.
16.00 "Тихий вечер". Л.Гурченко.
16.30 "Звук моих шагов". Дм.Красновцев.
17.00 "А.С.Пушкин. Версия-99". "Граф Нулин".
17.30 Новости.
17.35 "Луизианский блюз". Док. фильм.
18.35 "Поезд на третьем пути". Дон Аминадо.
19.05 Чудо-сказка.
19.20 Б.Эйфман. Телеверсия балета "Братья Карамазовы".
20.15 "Машина моды". Часть 2-я.
20.59 Азбука.
21.20 "Венецианский карнавал".
22.05 "Коллекция". Стихи Саши Черного.
22.15 "Путь на восток". Худ. фильм (США). 2-я часть.

НТВ

7.00, 9.00, 11.00, 15.00 Сегодня.
7.15 Э.Тейлор, Д.Фонда и А.Гарднер в фильме-сказке "Синяя птица".
9.15 Комедия "Не послать ли нам... гонца?"
11.25 "Белый Бим, Черное Ухо". Худ. фильм. 1-я и 2-я серии.
14.30 "Любовные истории, которые потрясли мир". "Рита Хейуорт и Орсон Уэллс" (США — Великобритания).
15.30 "Семнадцать мгновений весны".

"МОГИЛЕВ-1" на БТ

14.05 Тяжелый день.
14.30 Бобруйский вариант.
14.50 Мультфильм.

"МОГИЛЕВ-1"

17.30 "Школьный учитель".
18.20 "Красная полоса". Док.фильм.
18.45 Мультфильм.
19.00 Служба ваших забот. В студии начальник ПО ЖКХ Могилевского горисполкома Е.Майданюк.
19.35 Праздник в вашем доме.
20.20 Телемагазин.
20.30 День области.
20.50 Астро-дайджест.
21.00 Праздник в вашем доме.
21.35 "Девушка в кадиллаке". Комедия.
23.00 День области.
23.10 "Без присмотра". Триллер.

2 КАНАЛ

18.00 "Дерзкие и красивые".
18.30 Муз. антракт.
18.40 "Союзмультфильму — 60".
18.57, 20.40 Прогноз погоды.
19.00 "Удивительные истории". Телесериал.
19.25 "Поздравления".
20.30 Мультфильм.
20.43 "Пляж".
21.30 Высокая мода.
21.40 Боевик "Авария".
23.15 Спортивная программа.

Среда, 5 мая

БТ

6.30, 7.10 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 23.40 Новости.
8.00 "Алло, "Событие".
8.40 Потребительская корзина.
9.10 ТВ — школе.
9.40 Видеокурс английского языка.
10.05 "Земляки". Программа по письмам телезрителей.
11.10 Новые имена.
11.20 "Ветер в спину".
12.05 Око.
12.25 Зорная ростань.
13.15 Видимо-невидимо.
14.25 Ток-шоу "Карамболь" с участием творческого коллектива радио "Мир" и Лаймы Вайкуле.
15.15 "Чародей-2. Страна Великого Дракона".
15.40 Мультфильм.
15.50 "5 х 5".
16.20 "Куда пойти учиться?"
16.45 Поэтические новеллы. "Дорогами войны". Передача 3-я.
17.10 "А музыка звучит..."
17.35 "Судьба моя и надежда".
18.05 "Ветер в спину".
18.50 Новые имена.
19.15 "Сегодня с вами..."
19.45 Спортивные новости.
20.00 Добрый вечер, Беларусь!
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 "Дыхание грозы". Худ.фильм. 2-я серия.
23.00 Криминальная хроника.
23.05 Белорусский хит-парад.
23.10 Королевская охота.
23.50 Темная комната. Дайджест.

ОРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00 Новости.
8.15 "Во имя любви".
9.15 Футбольное обозрение.
9.45 Мультфильм.
10.10 В мире животных.
10.50 Домашняя библиотека.
11.15 Программа "Вместе".
14.15 Сериал "Космическая полиция".
14.45 Классная компания.
15.00 Зов джунглей.
15.30 ...До шестнадцати и старше.
16.00 "Во имя любви".
17.15 Угадай мелодию.
17.50 Человек и закон.
18.30 Г.Польских и Н.Олялин в фильме "Обратной дороги нет". 1-я серия.
19.45 "Спокойной ночи, малыши!"
20.00 Время.
20.45 Комедия "Не может быть!"
22.30 Однако.
22.45 Хоккей. Чемпионат мира. Сборная Чехии — сборная США.

"РОССИЯ"

6.00 Доброе утро, Россия.
9.10 "Миледи".
10.00, 16.00, 19.00, 23.05 Вести.
15.15 Музыка, музыка...
15.25 "Первые поцелуи".
16.30 "Башня".
17.00 Гомеопатия и здоровье.
17.10 Телесериал "Майор Вихрь". 1-я серия.
18.30 "Рождественская сказка черной змеюки". Телесериал (Великобритания).
19.40 Подробности.
19.55 Сам себе режиссер.
20.25 Е.Сидихин, С.Гармаш, Н.Егорова в боевике "Волчья кровь".
22.05 "Жара в Лос-Анджелесе".
23.35 Автошоу.
0.05 Магазин на диване.

"КУЛЬТУРА"

9.10 "Сиротки бури". Худ. фильм (США). Часть 1-я.
10.35 Затеси Виктора Астафьева.
11.30, 13.30, 19.30, 23.00 Новости культуры.
11.40 После новостей...
12.00, 13.45 Дж.Верди. Опера "Фальстаф". В постановке театра "Ковент-Гарден".
13.29 Азбука.
14.45 Истоки.
15.00, 17.30 Новости.
15.10 "Лукоморье".
15.30 Цветы на камень Мандельштаму.
16.25 Экспедиция "Чиж".
16.50 Вышивальщица О.Лагутина.
17.00 "Кто мы?"
17.40 Ортодокс.
17.55 "Ноу-хау". Тележурнал.
18.10 "Документ-ретроспектива".
19.15 Чудо-сказка.
19.29 Азбука.
19.50 Г.Свиридов. "Метель". Русский камерный балет "Москва".
20.15 Живое дерево ремесел.
20.30 "Поэтические позвонки". Б.Слуцкий. Передача 1-я.
20.45 После новостей...
21.05 "Сиротки бури". Худ. фильм. Часть 1-я.
22.30 "Театр моей памяти".

НТВ

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00 "Сегодня утром".
8.10 Дог-шоу "Я и моя собака".
8.40 Мультфильм.
9.00, 11.00, 13.00, 15.00 Сегодня.
9.15 Г.Макарова и Г.Скоробогатова в фильме "Вдовы".
10.40 "Среда".
11.30 "Старый телевизор" вспоминает. "Мы, нижеподписавшиеся".
13.30 "Арина".
14.20 "Сегоднячко". Красная стрела.
15.20 "Семнадцать мгновений весны".
16.45 Впрок.
16.55 "Пленки и тайны Сансет Бич".

"МОГИЛЕВ-1" на БТ

14.25 Служба ваших забот. В студии начальник ПО ЖКХ Могилевского горисполкома Е.Майданюк.

"МОГИЛЕВ-1"

17.30 Мужской клуб. "Приключение на одну ночь".
18.25 ДАО.
18.45 Ток-шоу "Лестница".
19.25 Праздник в вашем доме.
20.20 Телемагазин.
20.30 День области.
21.50 Астро-дайджест.
21.00 Праздник в вашем доме.
21.35 "Неукротимый". Боевик.
23.35 День области.
23.45 Спорт планеты.

2 КАНАЛ

18.00 "Дерзкие и красивые".
18.30 Городские новости.
18.40 "Союзмультфильму — 60".
18.57, 20.40 Прогноз погоды.
19.00 "Случайный свидетель".
19.25 "Поздравления".
20.30 "В гостях у бабки Агапки".
20.43 "Пляж".
21.30 Городские новости.
21.40 "Бег Плато".
23.25 Спортивная программа.

Четверг, 6 мая

БТ

6.30, 7.10 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 0.30 Новости.
8.10 "Сегодня с вами..."
8.40 Потребительская корзина.
9.15 Королевская охота.
9.45 "Я рисую".
10.00 "Все мы родом из детства".
11.10 Новые имена.
11.15 Ко Дню Великой Победы. "Крест надежды". Док.фильм.
11.35 "Была война..." Киноконцерт.
12.00 Наш край.
12.25 "А музыка звучит..."
13.15 "Дочь командира". Худ.фильм.
14.20 "Приглашаем на вечерки".
15.10 "Чародей-2. Страна Великого Дракона".
15.35 Видеокурс английского языка.
16.00 ТВ — школе.
16.35 Усадьба.
16.55 Хоккей. Чемпионат мира. Беларусь — Украина. Трансляция из Норвегии. В перерывах (17.40, 18.35) — Новости.
19.35 Новые имена.
19.40 Спортивные новости.
20.00 Добрый вечер, Беларусь!
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 Крок.
22.55 Н.Волков и Г.Жженов в худ.фильме "Путь в "Сатурн" ("Мосфильм").
0.20 Криминальная хроника.
0.25 Белорусский хит-парад.
0.40 Акколада.

ОРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00 Новости.
8.15 "Во имя любви".
9.20 Человек и закон.
10.05 Клуб путешественников.
10.50 Домашняя библиотека.
11.15 Программа "Вместе".
14.15 Сериал "Космическая полиция".
14.45 Волшебный мир, или Синема.

15.00 Улица Сезам.
15.30 ...До шестнадцати и старше.
16.00 "Во имя любви".
17.15 Угадай мелодию.
17.50 "В поисках утраченного". Клавдия Шульженко.
18.30 "Обратной дороги нет". 2-я серия.
19.45 "Спокойной ночи, малыши!"
20.00 Время.
20.45 Хоккей. Чемпионат мира. Сборная России — сборная Финляндии.
22.35 Однако.
23.35 Комедия "Жил-был полицейский".

"РОССИЯ"

6.00 Доброе утро, Россия.
9.10 "Миледи".
10.00, 16.00, 19.00, 23.05 Вести.
15.15 Музыка, музыка...
15.25 "Первые поцелуи".
16.30 "Башня".
17.00 Гомеопатия и здоровье.
17.10 "Майор Вихрь". 2-я серия.
18.30 "Стриндберг глазами русских". Фильм 1-й.
19.40 Подробности.
19.55 "Два рояля".
20.40 Т.Васильева, В.Ильин и А.Жарков в мелодраме "Белый король, красная королева" (Россия — Швейцария).
22.20 "Слушается дело".
23.35 Горячая десятка.
0.30 Магазин на диване.

"КУЛЬТУРА"

7.05, 11.30, 13.30, 19.30, 23.00 Новости культуры.
7.25 Ноу-хау.
7.35 "Документ-ретроспектива".
8.35 Вижу цель!
9.05 "Сиротки бури". Худ. фильм.
10.20 "Полюбил я тебя, моя радость..."
11.00 "Театр моей памяти".
11.40 После новостей...
12.00 Ваше сословие.
12.25 Правдашняя высота Леонарда Лавлинского.
12.55 Ключи серебряные.
13.29 Азбука.
13.45 Страна Фестивалия.
14.10 Г.Бакланов. "Был месяц май".
14.25 Боярский двор.
15.00, 17.30 Новости.
15.10 "Лукоморье".
15.30 "Царская ложа". В.Самодуров.
16.10 Андрей. Вспоминая артиста.
17.05 Поэт Д.Хворостовский.
17.35 Новое кино.
18.00 "Российский курьер".
18.40 В.Астафьев. "Один посреди России". Телеспектакль.
19.15 Чудо-сказка.
20.00 Ч.Айтматов. "Плаха". Фрагмент из романа.
20.15 "Осенние портреты". Е.Пастернак.
20.45 После новостей...
21.05 "Поэтические позвонки".
21.20 "Сиротки бури". Худ. фильм. Часть 2-я.
22.35 Джазофрения.

НТВ

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00 "Сегодня утром".
8.10 "Любовь и тайны Сансет Бич".
9.00, 11.00, 13.00, 15.00 Сегодня.
9.20 Фильм "Иона во чреве кита".
11.30 "Мы, нижеподписавшиеся".
13.30 "Детектив Нэш Бриджес".
14.20 "Сегоднячко". Красная стрела.
15.25 "Семнадцать мгновений весны".
16.40 Впрок.
16.55 "Любовь и тайны Сансет Бич".

"МОГИЛЕВ-1"

17.30 Ток-шоу "Я сама".
18.30 Из жизни женщин.
19.00 Родительский час."Развитие способностей у детей".
19.45, 21.00 Праздник в вашем доме.
20.20 Телемагазин.
20.30 День области.
20.50 Астро-дайджест.
21.35 "Жених с того света". Комедия.
22.25 День области.
22.35 "Смертельный поцелуй". Драма.

2 КАНАЛ

18.00 "Дерзкие и красивые".
18.30 Муз. антракт.
18.40 "Союзмультфильму — 60".
18.57, 20.50 Прогноз погоды.
19.00 "Чтобы помнили".
19.25 "Поздравления".
20.30 Мультфильмы.
20.53 Док. фильм.
21.25 Высокая мода.
21.30 К.Костнер в фильме "Идеальный мир".
23.40 Спортивная программа.

•• Пятница, 7 мая ••

БТ

6.30, 7.10 Доброе утро, Беларусь!
7.00, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 16.50, 19.00, 0.40 Новости.
8.15 Политические диалоги.
8.40 Потребительская корзина.
9.10 ТВ — школе.
9.45 Видеокурс английского языка.
10.10 Уроки Н.Новожиловой.
10.35 Усадьба.
11.10 Новые имена.
11.20 "В объективе — вся Земля".
11.45 Четвертое измерение.
12.10 Сделано в Беларуси.
12.25 Ко Дню работников радио, телевидения и связи: "Смехоассорти".
13.10 "Мой Минск. Док. фильм.
13.50 Бон тон.
14.20 Новые имена.
14.25 "Смотреть в глаза". Заслуженный деятель искусств РБ В.Анисенко.
15.10 "А музыка звучит..."
15.30 "На волнах эфира". Телеочерк.
16.00 Регион.
16.20 "Риск-версия". Телеигра.
17.00 Торжественное заседание и концерт, посвященные Дню Победы.
19.15 "Сегодня с нами..."
19.45 Спортивные новости.
20.00 Добрый вечер, Беларусь!
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 Худ. фильме "Конец Сатурна".
23.35 Футбол. Чемпионат Республики Беларусь. "БАТЭ" (Борисов) — "Гомель". 2-й тайм.
0.30 Криминальная хроника.
0.35 Белорусский хит-парад.

ОРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00 Новости.
8.15 "Во имя любви".
9.15 Смехопанорама.
9.55 "В поисках утраченного".
10.30 Смак.
10.50 Домашняя библиотека.
11.15 Программа "Вместе".
14.15 "Я первый тебя увидел". Х/ф.
15.25 Мультфильм.
16.00 "Во имя любви".
17.15 Джентльмен-шоу.
17.55 Здоровье.
18.30 "Обратной дороги нет". 3-я серия.
19.45 "Спокойной ночи, малыши!"
20.00 Время.
20.45 Хоккей. Чемпионат мира. Матч команд финальной группы.
22.35 Однако.
23.35 Детектив "В полосе прибоя".

"РОССИЯ"

6.00 Доброе утро, Россия.
9.05 "Миледи".
10.00, 16.00, 19.00, 23.15 Вести.
15.15 Музыка, музыка...
15.25 "Первые поцелуи".
16.30 "Башня".
17.00 Гомеопатия и здоровье.
17.10 "Майор Вихрь". 3-я серия.
18.30 "Стриндберг глазами русских".
19.40 Подробности.
19.55 "Аншлаг" и К°.
21.00 Праздничный концерт.
22.40 Подиум д'арт.
23.45 Психологическая драма "Баритон".

"КУЛЬТУРА"

7.05, 11.30, 13.30, 19.30, 23.05 Новости культуры.
7.25 Консилиум.
7.50 Поэма "За далью даль".
8.35 Играет квартет "Сказ".
9.05 "Разбег". Худ. фильм.
10.20 Художник В.Духовлинов.
10.50 "Российский курьер".
11.40 После новостей...
12.00 "Воскресенье в провинции".
12.45 "Ангелом задетый". В.Набоков.
13.45 Славянский марш.
14.30 Театр "Модерн".
15.00, 17.30 Новости.
15.10 "Лукоморье".
15.30 Чемпионат Европы по вольной борьбе.
16.00 Монологи о Рубене Симонове.
17.00 "Кто там..."
17.40 Микрофон включен.
18.00 Страна Фестивалия.
18.25 П.Чайковский. "Времена года".
19.05 А.Аверченко. "Диабет".
19.15 Чудо-сказка.
19.50 Док. фильм (Франция).
20.45 После новостей...
21.05 "Разбег". Худ. фильм.
22.20 "Pro memoria".
22.35 Е.Образцова. Романсы Г.Свиридова на стихи А.Блока.

НТВ

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00 "Сегодня утром".
8.10 "Любовь и тайны Сансет Бич".
9.00, 11.00, 13.00, 15.00 Сегодня.
9.15 Наше кино. Фильм "Суворов".
11.30 "Мы, нижеподписавшиеся".
13.30 "Детектив Нэш Бриджес".
14.20 "Сегодняшко". Красная стрела.
15.30 "Семнадцать мгновений весны".

"МОГИЛЕВ-1" на БТ

13.50 Родительский час.
14.30 ДАО.
14.50 Мульфильм.

"МОГИЛЕВ-1"

17.30 "Полиция Лос-Анджелеса".
18.20 "Чернобыль:13 лет спустя".
18.45 Мультфильм.
19.00 В мире эллипсов.
19.40, 21.00 Праздник в вашем доме.
20.20 Телемагазин.
20.30 Пунктир.
21.00 Астро-дайджест.
21.45 "Тройной удар".Боевик.
23.15 День области.
23.25 Футбол. Чемпионат Беларуси. "Днепр-Трансмаш" — "Молодечно".

2 КАНАЛ

18.00 "Дерзкие и красивые".
18.30 Городские новости.
18.40 "Союзмультфильму — 60".
18.57, 20.40 Прогноз погоды.
19.00 "Альфред Хичкок представляет".
19.25 "Поздравления".
20.30 "В гостях у бабки Агапки".
20.43 Док. фильм.
21.10 Высокая мода.
21.30 Городские новости.
21.40 "Танго и Кэш".
23.25 Музыкальная коллекция.

•• Суббота, 8 мая ••

БТ

7.00 Доброе утро, Беларусь!
8.00 Континент.
8.15 Столица.
8.40 Потребительская корзина.
9.00, 15.00 Новости.
9.10 Родовод.
9.45 "Сегодня с вами..."
10.10 Здоровье.
10.35 Вершина мира.
11.00 Компьютерный полигон.
11.25 "Все нормально, мама!"
12.00 Спортивные новости.
12.20 Усадьба.
12.40 Новые имена.
12.45 "Династия-2. Семья Колби".
13.30 Сущность. К 2000-летию христианства. Древние храмы Беларуси.
13.55 Зорная ростань.
14.25 Олимп.
15.10 Уроки Н.Новожиловой.
15.35 Познай себя.
15.55 "Все мы родом из детства".
16.50 Парламентский вестник.
17.20 Ток-шоу "Это моя работа". Ко Дню Победы.
18.55 "Когда поют солдаты". Конкурс солдатской песни.
19.40 Из достоверных источников.
20.00 Новые имена.
20.05 Бездельник.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Н.Волков и Г.Жженов в худ.фильме "Бой после Победы". 1-я и 2-я серии.
0.20 Белорусский хит-парад.
0.25 Видимо-невидимо.

ОРТ

7.00 Приключенческий фильм "Один шанс из тысячи".
8.20 Мультфильм.
8.25 Слово пастыря.
8.45 Домашняя библиотека.
9.00, 14.00 Новости.
9.15 Программа "100%".
9.45 "Утренняя почта".
10.20 "Каламбур".
10.50 Смак.
11.15 Возвращение Третьяковки.
11.25 "Несколько мгновений войны".
12.15 "...До шестнадцати и старше".
12.45 Фильм "Обыкновенный фашизм". 1-я серия.
14.15 2-я серия фильма "Обыкновенный фашизм".
15.20 В мире животных.
16.05 "Ералаш".
16.35 "Апокалипсис для полицая".
17.05 С.Ротару в программе "Люби меня".
19.00 Поле чудес.
20.00 Время.
20.45 Фильм "В бой идут одни старики".
22.20 Новости спорта.
22.40 К.Денев и Ж.Депардье в фильме "Последнее метро".

"РОССИЯ"

7.00 "Жила-была девочка". Худ. фильм.
8.10 Мультфильмы.
8.30 Мультфильмы.
9.00 Доброе утро, страна.
9.30 Сам себе режиссер.
10.00 "Сто к одному". Телеигра.
10.45 Любовь с первого взгляда.
11.15 Золотой ключ.
11.30 Домашние хлопоты.
12.00 "Россия в войне. Кровь на снегу". Док. сериал. Фильм 7-й. "Цитадель".
13.00, 19.00 Вести.
13.30 Неделя власти.
14.00 "Ты — моя мелодия". Концерт А.Пахмутовой и Е.Добронравова.
16.00 Национальный музыкальный фестиваль "Площадь звезд-99".
17.00 Моя семья.
18.00 Старая квартира. Год 1984-й.
19.35 Концерт, посвященный Дню радио.
21.20 Мелодрама "Военно-полевой роман".
22.35 Р.Стайгер, Ф.Неро, Г.Фонда в кинодраме "Муссолини. Последний акт".

"КУЛЬТУРА"

9.10 "Читая Библию".
9.20 Книжный кладезь.
9.35 "Мировая деревня". "Я хочу, чтобы это услышали".
10.05 "Подвиг разведчика". Худ. фильм.
11.35 Пишет домой война...
12.20 "Тайна пирамид". Док. фильм (Франция). 1-я серия.
13.10 Мультфильм.
13.30, 21.00 Новости культуры.
13.44 Азбука.
13.45 "Легенды театра". Б.Ливанов.
14.00 Майскими короткими ночами.
14.25 "Знаменитые замки Европы".
14.50 "В шесть часов вечера после войны". Худ. фильм.
16.20 "Кумиры". Кирилл Лавров.
16.50 Формула музыки.
17.30 Новости.
17.35 "Судьба, судьбою, о судьбе".
18.30 Мультфильм.
18.50 Чудо-сказка.
19.05 "15-й подъезд".
19.30 "XX век в кадре и за кадром". Сергей Урусевский.
20.25 Блеф-клуб.
20.59 Азбука.
21.20 "Дом актера". "Ветераны сцены".
21.50 "Фламенко". Док. фильм.

НТВ

7.00, 9.00, 11.00, 13.00 Сегодня.
7.15 М.Ладынина, Н.Крючков и П. Алейников в музыкальной комедии "Трактористы".
8.40 "Фитиль".
9.15 Л.Броневой, А.Михайлов, О.Остроумова и М.Глузский в фильме "Похищение "Савойи".
11.15 Михаил Кононов, Олег Борисов и Виктор Павлов в фильме "На войне как на войне".
13.15 Фестиваль "Золотой Остап".
15.00 "Семнадцать мгновений весны". 12-я серия, заключительная.
16.10 "Семнадцать мгновений весны" 25 лет спустя". 2 части.

"МОГИЛЕВ-1"

17.30 "Поют солдаты".Концерт академического ансамбля песни и танца Вооруженных Сил Республики Беларусь.
18.55 С любовью.
20.25 Телемагазин.
20.35 "Солдаты".Худ.фильм.
22.15 Астро-дайджест.
22.25 Телепоцман.
22.45 "Побег из Собибора".Худ.фильм.

2 КАНАЛ

15.00 "Беляночка и розочка". Фильм — детям.
16.05 Муз. антракт.
16.30 Мультфильмы.
17.00 "Поздравления".
18.00 "Благая весть с Риком Реннером".
18.30 "Поздравления".
19.30 Индийское кино. "Неудачное замужество".
21.50 Высокая мода.
22.00 Комедийный боевик "Метро".
23.50 Спортивная программа.

•• Воскресенье, 9 мая ••

БТ

7.00 Доброе утро, Беларусь!
8.00 "День Победы. Память".
8.15 Концерт народного хора ветеранов войны и труда "Надежда" Дворца железнодорожников г.Молодечно.
8.45 "День Победы". Трансляция из Бреста.
9.00, 13.00, 15.00, 17.00 Новости.
9.15 Мультиклуб.
9.50 "Земля, землянка, земляки..." Док. фильм БТ.
10.15 Белорусский дом.
10.45 "День Победы. Память".
11.00 Торжественное шествие, посвященное Дню Победы.
12.00 Арсенал.
12.25 "АРТ-клуб".
13.20 "Я мечтал увидеть Беларусь". Видеофильм.
13.45 "А музыка звучит..."
14.00 "День Победы". Трансляция из Бреста.
14.15 Сельчане.
14.40 "День Победы. Память".
15.30 К 10-й годовщине Конвенции о правах ребенка. Ток-шоу "Это XXI".
16.20 Премьера песни.
16.30 "День Победы. Память".
16.45 Светлой памяти павших в борьбе против фашизма. Минута молчания.
17.35 Телевизионный Дом кино.
18.00 "День Победы". Трансляция из Бреста.
18.15 "Полонез Огинского". Худ. фильм ("Беларусьфильм").
19.40 Колыбельная.
20.00 Резонанс.
21.00 Республиканский телефестиваль патриотической песни "Память".
23.00 Теленавигатор.
23.20 Ток-шоу "Карамболь". Ко Дню Победы.
23.50 Стадион.
0.10 Телебарометр.
0.25 "А музыка звучит..."

ОРТ

6.00 Телеканал "Доброе утро".
8.50 Москва. Красная площадь. Военный парад, посвященный Дню Победы.
9.30 К.Шульженко, М.Бернес, А.Пугачева, Л.Лещенко и другие в праздничном концерте по заявкам ветеранов.
10.45 Служу России!
11.15 Звездный час.
11.50 Играй, гармонь любимая!
12.20 Киноэпопея "Живые и мертвые". 1-я серия.
14.00 Новости.
14.20 2-я серия киноэпопеи "Живые и мертвые".
16.00 "Как это было". "Вечный огонь".
16.40 "Майскими короткими ночами..." Киноконцерт.
17.50 "Светлой памяти павших в борьбе против фашизма". Минута молчания.
18.10 Худ. фильм "Летят журавли".
20.00 Время.
20.25 Худ. фильм "Белорусский вокзал".
22.15 Хоккей. Чемпионат мира. Матч команд финальной группы.
22.55 Новости культуры.

"РОССИЯ"

7.00 Мультфильм.
7.25 Служу Отечеству.
7.55 Сельские вести.
8.25 "Жди меня". Киноконцерт.
8.50 Военный парад, посвященный Дню Победы.
9.40 "Виктория". Фестиваль солдатской песни.
11.00 Русское лото.
11.40 Мир книг.
12.00 "Россия в войне. Кровь на снегу". Док. сериал. Фильм 8-й. "Ложный рассвет".
13.00 Вести.
13.40 Никто не забыт.
13.55 Футбол. Чемпионат России. "Динамо" (Москва) — "Жемчужина" (Сочи).
15.50 Концерт для ветеранов Великой Отечественной войны.
17.50 "Светлой памяти павших в борьбе против фашистских захватчиков". Минута молчания.
18.05 "Россия в войне. Кровь на снегу". Фильм 9-й. "Падение свастики".
19.00 Зеркало.
20.00 Киноповесть "Был месяц май".
22.05 Военные корреспонденты в программе "Колизей".
23.00 Психологическая драма "Чердак: убежище Анны Франк".

"КУЛЬТУРА"

9.10 "Читая Библию".
9.20 "Солдат и слон". Худ. фильм.
10.35 Консилиум.
11.00 Д.Шостакович. "Седьмая симфония".
11.45 "Город в осаде". Док. фильм.
12.05 "Сказка сказок". Мультфильм.
12.35 "Тайна пирамид". Док. фильм. 2-я серия.
13.29 Азбука.
13.30, 17.30, 21.00 Новости культуры.
13.45 А.Чирков. "Штрихи к портрету художника".
14.10 Музыкальный экспромт.
14.25 "Знаменитые замки Европы".
14.50 Е.Носов. "Красное вино победы". Телеспектакль.
15.50 Про фото.
16.30 "Это в сердце было моем..." Алексей Баталов.
16.55 Песни войны поет Л.Гурченко.
17.35 Музыкальный антракт.
17.50 "Светлой памяти павших в борьбе против фашистских захватчиков". Минута молчания.
18.05 Док. фильмы.
18.50 Мультфильм.
19.15 Чудо-сказка.
19.30 "Пикассо и танец". Гранд-опера, Париж.
20.59 Азбука.
21.20 Памяти Булата Окуджавы.
22.00 "Телевернисаж". Г.Майофис.
22.05 "Терпкий виноград". Худ. фильм.

НТВ

7.00, 9.00, 11.00, 15.00 Сегодня.
7.15 Мультфильм.
7.25 Приключенческий фильм "Тимур и его команда".
9.15 В.Тихонов, Л.Быков и Н.Крючков в фильме "Майские звезды".
11.20 "Старый телевизор" вспоминает: "Сентиментальный марш".
12.35 О.Даль в фильме "Женя, женечка и "Катюша".
14.00 "Арина".
15.30 Футбол. Чемпионат России. "Спартак" (Москва) — ЦСКА (Москва).

2 КАНАЛ

15.00 "Завтра была война". Худ. фильм.
16.25 Муз. антракт.
16.35 "Шестнадцатилетние".
17.00 "Поздравления".
18.00 Джойс Майер. "Жизнь в слове".
18.30 Мультфильмы.
19.00 "Хищники".
19.50 "Секретные материалы".
20.35 Мультфильм.
20.40 "Пляж".
21.25 Высокая мода.
21.30 "В бой идут одни старики".
22.55 Спортивная программа.

ВАНДРОЎКА ЗА КРАТЫ

Заканчэньне.
Пачатак у №№7 – 16

Без праблем даяжджаем да Ліды. Тут аўтазэк загружаецца іншым кантынгэнтам – тымі, хто едзе на турму, а нас перакідваюць у аўтазэк-аўтобус, што паедзе па маршруце Ліда-Ашмяны-Астравец-Смаргонь. Бачу, як у турэмны фургон падымаецца на мыліцах Зянон. Пасьпяваю крыкнуць яму вітаньне. Ля паловы на пятую – сонца ўжо зашло – мяне, Алега і яшчэ аднаго вязьня высаджваюць ля Астравецкага ИВСа.

Фармальны павярхоўны шмон і – даволі чыстая камэра, памерамі з малы гулачны дворык. Тры чалавекі могуць спакойна гуляць, не натыкаючыся адзін на аднаго. Пара двух'ярусных нар з драўляным насьцілам, драўляная фарбаваная падлога. У вопратцы – дастаткова цёпла. Вільгаць – як у Пэтрапаўлаўскай крэпасьці. Унітаз. Раззткі і вадаправод адсутнічаюць.

Я – чацьверты ў камэры. Займаю вольныя нары ўнізе. Сядзельцы – два «вопытных» і адзін «па першаму разу», але ўжо асуджаны на пяць гадоў малады хлопец, арыштаваны за некалькі дзён да вясельля. Вясельле так і не адбылося, нявеста – цяжарная, а наперадзе – зона. «Вопытных» яшчэ будуць судзіць, ды ўлічваючы, што «рэцэдэ» – дабрыні ад суда не чакаюць.

Дні і ночы праходзяць, пераважна, у размовах, а таксама ў заварцы й расьпіцьці гарбаты. Слухаю расповяды пра месцы зьняволеньня і свабоднае жыцьцё былых зэкаў, вершы і песьні, што ніколі ня чуў раней.

Думаю, мэдытую, рыхтуюся да суда. З задавальненьнем харчуюся смачнай і якаснай ежай зь мясцовай сталоўкі. Спазнаю сакрэт кіпячэньня гарбаты ў плястыкавай (!) бутэльцы.

Серада, 14 студзеня. Нас з Алегам прысьцёгваюць адзін да аднаго «брасьлетамі» і вядуць да аднапавярховага будынку суда ў сотне мэтраў ад ИВСа. Вакол – дрэвы, акуратныя домікі, пэрспэктыва аж за далягляд. Недзе там – Летува. Так прыемна дыхаць незачыненай прасторай!

Уваходзім у будынак. Заля, дзе зараз пачнецца суд. Наша месца – лава падсудных. Сябра з дыктафонам. Да першага перапынку – хлопец зь мясцовай газэты. Мясцовы актывіст АГП. Жонка. Адвакаты: Уладзімер Кісялевіч – мой, Уладзімер Грышкевіч – Алегаў. Маці і сястра Алега. Астатнія – сьведкі-памежнікі, супрацоўнікі МУС і суда. Вось і ўвесь кантынгэнт. Для памежнага, збольшага каталіцкага і «тутэйшамоўнага» Астраўца пераходы мяжы па-за пунктам пропуску – рэаліі паўсядзённага жыцьця.

Пытаньні да падсудных. Пытаньні да сьведкаў. Пытаньняў да суда ў нас няма. Зацягваць працэс – зусім ня ў нашых інтарэсах. Але агалошаньне прысуду пераносіцца на наступны дзень. Пэўна, для страхоўкі: а раптам прыйдзе канкрэтнае ўказаньне зьверху?..

Чацьвер, 15 студзеня. Суд прызнае нас з Алегам вінаватымі ў наўмысным групавым пераходзе мяжы, але, улічваючы пяць месяцаў турмы і цяжкае сямейнае становішча абодвух, прымяняе артыкул 42 (меней за меншае) і абмяжоўваецца штрафам. Зыск вайсковай часткі 2044 застаецца незадаволеным – пераможны вынік тагачаснай галадоўкі! На разьвітаньне заношу сукамэрнікам два пачака гарбаты. Іх свабода яшчэ няхутка.



Да гомельскай кватэры дабіраемся з жонкай на пparticularкладных, разьвітваючыся зь сябрамі ў Астраўцы, Смаргоні, Менску. Свабодны рух па незачыненай прасторы яшчэ падаецца крыху незвычайным.

Хатні тэлефон дае некалькі прыемных хвілін. З вызваленьнем віншуюць знаёмыя журналісткі: Ірына Макавецкая зь «Белорусской деловой» (пакуль я быў за кратамі, Ірына дапамагала майму сыну вопраткай, смачнымі падарункамі і ўвагай, спрабавала – праўда, безвынікова – зьмясьціць у сваёй газэце хоць які матэрыял пра маё заключэньне), Тацяна Сьнітко са «Здравого смысла» («ЗС» пісаў пра мяне рэгулярна ў апошнія закратныя тыдні, больш падрабязна за іншых асьвятляў суд, а пасьля майго выгнаньня зь «Беларускай Маладзёжнай» узяў «пад свой дах»); Анатоль Фёдараў з Магілёва. Уражвае званок з Масквы – ад «Московского Комсомольца».

Літаральна «назаўтра» гісторыя з «МК» атрымлівае нечаканы працяг. Генадзь Лех, галава маскоўскіх беларусаў (якія, між іншым, дасылалі найбольшую дапамогу сям'і), расхваляваны, тэлефануе да нас: з паведамленьня «МК» вынікае, што мяне нанова «пасадзілі»...

Пра тое, што нанова трапляю ў турму, прысьніў праз некалькі месяцаў. Пакутліва-вострая думка: цяпер дапамагаць ніхто ня будзе. А зрэшты, гэта быў ня больш, чым сон. Проста я стаў за сябе адказным.

Грамадзкага рэзанансу не атрымалася. Не было пікетаваньня й збору подпісаў за маё вызваленьне. Сваім за кратамі не прызналі мяне ані журналісцкія, ані творчыя саюзы і арганізацыі. «Беларуская Маладзёжная», якую я ўзмоцнена рэклямаваў у турме, месяц па маім вызваленьні мною не цікавілася, а пасьля запатрабавала вярнуць ёй маё пасьведчаньне журналіста (фармальна – за інтэрвію «Навінам»). «Народная воля» і «Свободные новости», пратрымаўшы шматразова скарочаны варыянт гэтых успамінаў па некалькі месяцаў кожная, адмовіліся іх друкаваць. У першай, аказваецца, існуе манаполія на падобныя рэчы, а для другой – я проста чужы. Звычайны зэк. Выжывае падлейшы...

Але-ж не паехала гарадзенская моладзь у інтрыгуючую вандроўку, і на тыя грошы йшлі да мяне ў турму дачкі. Але ўрубаў прадпрымальнік Мацко мае песьні на поўны моц, праяжджаючы пад сьценамі турмы. Але дапамагалі маёй сям'і маскоўскія беларусы, гарадзенцы, гамельчукі сучасныя і былыя... Але маліліся за маё вызваленьне ў аршанскім касьцёле. Але адчувалася мною за кратамі чыясьці дапамога, нягледзячы на «каўпак» КГБ. Але паспрыялі па выхадзе на волю цьвёрда стаць на ногі людзі з Гарадзеншчыны, Магілёўшчыны, Гомельшчыны, Берасьцейшчыны, Меншчыны, Аршаншчыны...

Для звычайнага зэка – незвычайна шчасьлівы працяг.

СУЧАСНЫ ЛЕТАПІС
Андрэй МЕЛЬНІКАЎ

Праўды, свабоды
і розуму!

1.02.98

...Калі не змагацца за волю

У цяжкіх умовах працуюць актывісты прэзыдэнцкай выбарчай кампаніі ў Клічаве. Таму ёсьць шмат сьведчаньняў. Мясцовы кіраўнік «вэртыкалі» М.Ціцянкоў катэгарычна заявіў: «Я не дапушчу ніякіх выбараў». Канец мінулага месяца быў асабліва адзначаны праявамі беззаконьня з боку ўладных структураў.

21 сакавіка кіраўнік тэрытарыяльнай камісіі па выбарах прэзыдэнта РБ Міхаіл Долбік быў затрыманы й прыцягнуты судом да адміністрацыйнай адказнасьці за «дробнае хуліганства» і пакараны 15-суткавым арыштам. 22 сакавіка за гэта-ж свае 15 сутак атрымаў і сябра камісіі Васіль Альшэўскі. Наш карэспандэнт сустрэўся са спадаром Долбікам і задаў яму некалькі пытаньняў.

– *Спадар Міхаіл, як вас затрымалі?*

– 21-га сакавіка быў дома, адпачываў – нядзеля. Раптам прыяжджаюць міліцыянты й пытаюцца: «Ты даваў ліст для збора подпісаў жыхарам гораду?» Я кажу: «Даваў». Яны працягваюць, маўляў, вашых людзей затрымалі, паехалі з намі разьбірацца. Прыехалі ў міліцэйскі пастарунак. Сяджу ў пакойчыку. Хвілінаў праз 30 пытаюся: «Вы што, мяне затрымалі? Альбо выпускайце, альбо прад'яўляйце абвінавачваньне».

– *І што далей было?*

– А далей мяне кудысьці павезьлі, як потым высьветлілася – ў суд. Судзьдзя Аляксандар Камар зачытаў пратакол. Як я яго паслухаў, ажно вочы на лоб палезьлі. Напісана было, што я лаяўся на міліцыю нецэнзурнымі словамі. Пратакол падпісаў капітан міліцыі Леанід Салтан. У якасьці сьведкаў – яшчэ тры міліцыянты.

– *Як вы думаеце, яны самі дадумаліся да гэтага?*

– Дзе там. Відаць, падказаў начальнік міліцыі Міхаіл Таргоня, які на добрым рахунку ў прэзыдэнцкай «вэртыкалі». Я на судзе запытаўся: «Ну і як я лаяўся?» «Сьведкі» адводзілі вочы, маўчалі. Праз якіх 5 хвілін судзьдзя зачытаў вырок. Узялі мяне за рукі й павялі ў машыну. Памятаю, што адзін сэржант ціха сказаў: «Узялі грэх на душу...»



Потым прывезьлі мяне ў гарадзкі ізалятар часовага ўтрыманьня, абшукалі, забралі матузкі й грошы. У ізалятары я прабыў да панядзелка, а 22-га мяне павезьлі ў Бабруйскі пастарунак.

– *Колькі вас там было?*

– Спачатку нас было ў камэры 6 чалавек, потым сядзела ад 8-мі да 12-ці. Умовы ўтрыманьня былі самыя жорсткія. Сьвежае паветра амаль не паступала. Кармілі досыць сьціпла: скібка хлеба, кепская гарбата, малая порцыя макарон і невялікі кавалак мяса.

– *Выпадкаў гвалтоўнага абыходжаньня не было?*

– У адносінах да мяне – не, а вось Васіля Альшэўскага сэржант пабіў за тое, што ён не пасьпеў зранку «своечасова» завязаць матузкі. Дарэчы, самі турэмшчыкі казалі, што за апошнія два гады стала нашмат больш міліцэйскага свавольства й рэзка зьнізіліся нормы пайкі для асуджаных.

– *А як іншыя зьняволеныя ставіліся да вас?*

– Ведаеце што, добра. І размаўлялі, і дапамагалі. Цікавіліся апошнімі навінамі. Адзін зь іх казаў, што за агульныя 15 год адседкі ўпершыню бачыць «палітычнага». Другі выказаўся так: «Гляджу на вас і разумею, што рэжым у нас – антычалавечы». Зразумеў і я, што калі не змагацца за волю, то стане яшчэ горш.

Гутарыў
Алесь СЕРДЗЮКОЎ

Гвалту можна процістаяць па-навуковаму

У папярэднюю нядзелю ў Менску адбыўся нечарговы зьезд Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамады, падставай для якога была неабходнасьць удакладненьня Статута і прыняцьце Праграмы БСДГ у сувязі з перарэгістрацыяй палітычных партый і грамадзкіх арганізацый.

Кароткае слова аб сучаснай сытуацыі ў Беларусі і ў партыі сказаў старшыня яе Цэнтральнай рады Станіслаў Шушкевіч. Зьезд давыбраў Цэнтральную раду прадстаўнікамі новастворанных мясцовых філій, а таксама прыняў рэзалюцыю аб прызначаных на 16 траўня выбарах прэзыдэнта, падкрэсьліўшы, што «гэта адзіная магчымасьць для выхаду з канстытуцыйнага крызысу ў нашай краіне».

Перад пачаткам зьезда яго дэлегаты бралі ўдзел у сэмінары, які быў прысьвечаны абмеркаваньню негвалтоўных формаў супраціўленьня гвалту. Кожны ўдзельнік сэмінару атрымаў кнігу «Ненасільле і Беларусь» (зборнік артыкулаў вядомых беларускіх і замежных палітыкаў і журналістаў), выдадзеную пры падтрымцы амбасады Каралеўства Нідэрлянды ў Варшаве.

Уласная інфармацыя

Слова да нашых (магчымых) чытачоў

Дабрыдзень, мы вельмі рады таму, што ўрэшце Ты здолееш прачытаць нашыя словы на гэтых старонках. Мы – рэдакцыя «Бадзягі», моладзевай газэткі, якая пачынае жыцьцё на палосах «Тыднёвіка» ў рамках праекту «Вольная Моладзь».

Крыху пра гісторыю. «Бадзяга» пачаў сваё духовае існаваньне ў выглядзе магілёўскае газэткі «Тутэйшая». Так склаліся абставіны, ды й прыклаў сваю валасатую лапу Лёс, што вышэйназваная газэтка пераўтварылася ў «Бадзягу». Што-ж, каб вырасла дрэва, павінна загінуць зерня, ды й увогуле, новая рэдакцыя (нязьменны толькі «галоўны»), новы стыль, новы сьветапогляд...

Мы будзем працаваць, каб данесьці да Цябе карысную й цікавую інфармацыю (канешне, калі яна Табе ўвогуле патрэбная. Але гэта ўжо Твае праблемы).

Шмат казаць пра «Бадзягу» ня будзем – чытайце!..

РЭДАКЦЫЯ

БадZягА

Крывіцкая краіна

УСХОДНЕСЛАВЯНСКІЯ ПЛЯМЁНЫ І БАЛТЫ



Крывічамі называюць згуртаваньне ўсходнеславянскіх плямёнаў, што жыло ў вышніх плынях Дняпра, Заходняй Дзьвіны, Волгі, на паўднёвым беразе Чудскога возера (у былых Смаленскай, Віцебскай, Пскоўскай і часткова Віленскай ды Магілёўскай губэрнях). Назоў, магчыма, паходзіць ад слова «крэўныя» (блізкія па крыві), ад імя легендарнага родапачынальніка Крыва ці язычніцкага першасьвятара Крыва-Крывейта, узгоркавай мясцовасьці (крывізна). Працэс фарміраваньня крывічоў адбыўся ў другой палове першага тысячагодзьдзя ў выніку асыміляцыі славянамі мясцовых балцкіх і заходня-фінскіх плямёнаў. Напрыканцы першага тысячагодзьдзя аб'яднаньне распалася на тры групоўкі: полацкую, смаленскую й пскоўскую (ад назвы іх галоўных гарадоў). Паводле летапісаў, у Полацку існавала сваё ўласнае княжаньне крывічоў-палачан. У ваенна-адміністрацыйных адносінах падобныя племянныя княжаньні абапіраліся на сыстэму ўмацаваньняў (Полацак, Віцебск, Лукомль, Браслаў), на падмурку якіх пазьней сфармаваліся гарады. Першыя датаваныя зьвесткі пра крывічоў адносяцца да 859 году. Яны прымалі ўдзел у паходах кіеўскіх князёў Алега ды Ігара супраць Бізантыі. Напрыканцы Х-га стагодзьдзя на тэрыторыі расьсяленьня полацкіх крывічоў склалася Полацкае Княства. У выніку вялікай дзейнасьці племені Крывічоў імя іхнае памалу пашыралася на іншыя нашыя плямёны, і ўвесь наш народ называлі Крывіцкім, Крывічамі, а край – Крывіяй. Назва «крывіцкія землі» захоўвалася за тэрыторыяй Паўночнай Беларусі да першай чвэрці XIV стагодзьдзя. Крывічы праявілі вялікія арганізацыйныя й гандлёвыя здольнасьці. Яны ня толькі самі добра арганізаваліся, але нярэдка арганізавалі так-жа іншыя суседнія плямёны, якія ўваходзілі ў склад нашага народу. Дзеля таго на тэрыторыі гэтых плямёнаў зьяўляліся крывіцкія адміністратары й паўставалі крывіцкія калёніі. Аб гэтым цяпер сьведчаць мястэчкі й сёлы з назовамі, маючымі дачыненьне да крывічоў. Гэтак, маем мястэчка Крывічы ў Вялейскім павеце, сяло Крэва й Крыўск у Ашмянскім павеце, сяло Крывічы ў Лідзкім павеце й гэтак далей, нават на Палесьсі ёсьць назовы старога Крывіцкага паходжаньня. Стары замак, званы Крывым горадам, у Вільні быў таксама пастаўлены крывічамі.

Пазьней называлі народ наш беларусы, а край Беларусь. Назоў гэты ў дачыненьні да нашага краю сустракаецца з XIV стагодзьдзя ў нямецкіх пісьменьніках як «Weiss Russen», а палацкіе ў польскіх летапісах «Alba Russia», што значыць «Белая Русь». Слова «белы», паводле думкі некаторых вучоных, азначае «незалежны», «свабодны»: «Белая Русь» – свабодная Русь, незалежная, непадбітая татарамі. Назоўнае слова «белая» стаіць у залежнасьці ад вонкавага выгляду беларуса, а менавіта – крывіча: белых валасоў, белае скуры і ад таго, што ў беларусаў найбольш пашыраны, ва ўборах белы колер. Слова «Русь» паходзіць быццам ад старанямецкага слова «Rotsman», што значыць «вясьляр». Ад гэтага слова паўстаў прыметнік Rost, Ros, Rus, Ruots, а гэтак называлі фіны скандынаўцаў і высяленцаў са Скандынавіі на ўсходня-славянскія землі – Варагаў, якія гэтаксама называлі ад свайго прыметніка той край, дзе яны вандравалі. А вандравалі яны па ўсіх абшарах сучаснай Беларусі, Расеі ды Украіны.

Крывічы былі народам рослым і моцным, зь сьветла-русымі валасамі і зь сіня-шэрымі вачыма. Мужчыны насілі бароды, а жанчыны – доўгія валасы, заплеценыя ў косы. Адзеньне насілі белага колеру. З скураў дзікіх жывёл шылі кажухі. З авечай воўны яны ўмелі ткаць сукно, зь якога шылі белыя сярмягі. Зь лёну ткалі палатно на кашулі й іншую споднюю адзёжу. Летам мужчыны хадзілі ў белых кашулях з адкладным каўняром, завязаным чырвонай стужкай. На нагох, як летам, гэтак і зімою, мелі лыкавыя лапці. Мужчыны на галовах насілі шапкі зь белай воўны, а жанчыны – белыя намёткі. Такая вопратка захавалася ў некаторых мясьцінах Беларусі амаль да нашых часоў. З малых гадоў бацькі прывучалі сваіх дзяцей да працы, а таксама да суровасьці клімату: сьцюжы, сырасьці, ветру. Узімку, прыкладам, дзеці бегалі босыя па сьнезе. Паступова, дзякуючы такому навучаньню, зь іх выраслі загартаваныя й здаровыя людзі. Праца на полі, у лесе й на сенажаці не была ім цяжкой. Бацька вучыў сыноў гаспадарскай працы, страляць з лука, валодаць мечам і дзідай, а маці дбала пра дачок: навучала іх гатаваць стравы, ткаць, шыць, вышываць... Бацька быў галавою сям'і, а маці – ейным сэрцам.

Калі сын вырастаў і абзаводзіўся собскай сям'ёй, бацька дапамагаў яму ўладзіць гаспадарку й гэтая ўзаемная дапамога не спынялася й тады, калі сын аддзяляўся – і яна была не толькі паміж бацькам і сынам, але й паміж далёкімі сваякамі.

Ад спрадвечных часоў Крывічы-Беларусы займаліся земляробствам. Зямлю яны любілі й працавалі на ёй з ахвотай. У бальшыні яны сеялі збожжавыя расьліны, якія сеюцца на Беларусі й цяпер: жыта, ячмень, пшаніцу, грэчку, а таксама лён. Маючы шмат сенажацяў, нашыя продкі разводзілі таксама хатнюю жывёлу: коні, кароваў, авечкі, козы, і гадавалі сьвіней.

У той час было шмат дзікіх зьвяроў. Адны за іх нападалі на хатнюю жывёлу, а іншыя шкодзілі на палёх. Чалавек паляваў на зьвяроў, каб ад іх абараніцца. У небясьпечныя хвіліны ён не ўцякаў, але хаваўся ў скрытае месца й чакаў лепшага часу. Часамі наш продак хаваўся нават пад ваду й дыхаў праз гароціну, але калі небясьпека мінавала, ён выскокваў са схованкі ды нападаў на ворага. З паляваньня ён меў скуру й мяса. Мясам дзікіх зьвяроў ён харчаваўся, але пушыстыя скуры абменьваў на патробныя рэчы з-за мора. Тагачаснае паляўнічае ўзбраеньне было: дзіда, лук і нож. На зьвяроў ставілі пасткі, на птушак – сіло.

У рэках і азёрах Беларусі было ў тыя часы шмат рыбы. Нашыя продкі вельмі рана пачалі займацца рыбацтвам: лавілі яны рыбу пераважна сеткамі. Былі яны таксама добрымі пчалярамі. Мёдам яны харчаваліся, або варылі зь яго моцнае піва, якое таксама звалі мёдам. З воску рабілі сьвечкі.

Старадаўныя Беларусы займаліся й рамёствамі – бандарствам, ганчарствам, ткацтвам, кушнерствам, нават і кавальствам. У тыя далёкія часы рамёствы не былі асобным заняткам. Гэта ўсё рабілася ў вольны ад палявых работаў час.

Аб тым, як жылі нашыя продкі, можна шмат даведацца з курганоў. Яны ў вялікім ліку рассыпаныя па ўсёй Беларусі. Курганы насыпаліся на магілках багатых ці вядомых людзей. Цяпер ужо шмат курганоў раскапалі й знайшлі ў іх розныя рэчы, палажаныя старадаўнім звычаем у магілку разам зь нябожчыкам. Раней уважалі, што й на тым сьвеце нябожчык і есьць, і п'е, і займаецца тымі-ж справамі, што й пры жыцьці. Сярод рэчаў, знойдзеных у курганах: гаршкі, міскі, розная зброя, косьці жывёлаў або рыбаў, тканіны, срэбныя й залатыя пярсьцёнкі ды іншыя вельмі прыгожыя рэчы.

Алесь КРЭВА

Як на судзе – нічога, акрамя праўды!

Наш Адказ на прэс-рэліз Магілёўскае гарадзкое арганізацыі Маладога Фронту

Шырокае кола моладзі мела мажлівасьць прачытаць прэс-рэліз магілёўскага Маладога Фронту ад 1.04.99. «ТМ» дык нават надрукаваў цэлы рэпартаж пра гэтую падзею.

Афіцыйна папярэджваем усіх, хто чытаў яго і згаданы прэс-рэліз: гэта ня больш, чым першакрасавіцкі жарт. Але-ж, як ва ўсялякім жарце, у гэтай паперцы ё кавалачак праўды...

Сапраўды, Першага красавіка бягучага году магілёўскія маладафронтаўцы прыбіраліся ў двары свайго сядзібы (Ленінская 27-50). Але-ж рабілі гэта зусім не добраахвотна!

[illegible] заявы Андруся Кавалёва, старшыні арганізацыі, аб тым, што напярэдадні ўвесь горад быў заклеены запрашэньнямі на гэтае мерапрыемства, не маюць пад сабой глебы.

У прыватнай размове з афіцэрам Цэнтральнага РАУС таварышам Ч. (які пажадаў застацца невядомым) нам удалося высьветліць ісьціну. Вось гэтая размова (друкуецца ў скароце).

Ч.: *«31 сакавіка гэтага году, а трэцяй гадзіне ночы, нарадам міліцыі Цэнтральнага РАУС г. Магілёва была затрыманая пара маладафронтаўскіх адмарозкаў, якія займаліся: зборам подпісаў за вылучэньне З.Пазьняка кандыдатам на выбары 16 траўня 1999 году, распаўсюдам друкаваных выданьняў (вырабленых, да слова, з парушэньнем закону аб друку РБ) і, урэшце, самае жахлівае, нават спрабавалі пакінуць свае grafiti на сьценах роднага гораду. Спрабавалі... але не пасьпелі. Міліцыя ня сьпіць, хуліганы былі затрыманыя пры спробе намаляваць літару «Л» на будынку Сьледчага Аддзелу Цэнтральнага РАУС.*

Але-ж усе ведаюць дабрату, справядлівасьць ды й міласэрнасьць супрацоўнікаў Беларускае Міліцыі. І, нават у гэткай цяжкой сытуацыі, вартаўнікі правапарадку пайшлі насустрач маладым грамадзянам Рэспублікі. Замест 10 год пазбаўленьня волі хлапчукі атрымалі пакараньне працай: яны паставілі свае подпісы за тое, што навядуць парадак у двары сваёй «маліны», дзе яны самі (маладафронтаўцы) ўсё заблявалі, абмачылі й ... (расьпіску гэтую можна знайсьці ў архіве). Гэткім чынам атрымалася, што 1 красавіка, пад наглядам супрацоўнікаў АМАП, маладафронтаўцы былі вымушаныя ўсім калектывам дапамагаць сваім «[illegible]» сябрам.

Нягледзячы на тое, што праўда пра гэтае мерапрыемства ўжо высьветлена, мы далі магчымасьць выказаць свае тлумачэньні й прадстаўніку кіраўніцтва МФ спадару А.Д. (які таксама пажадаў застацца невядомым).

А.Д.: *«Усё адбылося гэтак: сапраўды, уначы 31 красавіка 1999 году два прадстаўніка [illegible] масамі Маладога Фронту рухаліся з боку ўправы МФ (дзе яны ўвесь дзень да ночы абмяркоўвалі шляхі выхаду з эканамічнага крызісу) дахаты. На перакрыжаваньні вул. Ленінскай і вул. Лібкнехта да іх прычапіліся двое п'яных у цывільным. Зразумела-ж, законапаслухмяныя маладафронтаўцы павінцілі іх (п'яных) ды й даставілі ў памяшканьне Цэнтральнага РАУС, дзе высьветлілася, што яны (п'яныя) ёсьць супрацоўнікамі МУС.*

Натуральна, што ўсё МУС РБ не перажыла б гэткай ганьбы. Таму, адзін гэтакі занадта ініцыятыўны маёр (мы ўжо ведаем, дзе ён жыве!) прапанаваў прадставіць справу па-іншаму. Астатняе й так зразумела...»

Як бачыце, прадстаўнік Маладога Фронту не адмаўляе таго, што акцыя была ініцыявана супрацоўнікамі міліцыі. Застаецца зазначыць яшчэ адзін факт недастатковай інфармаванасьці насельніцтва: жыхары будынка №27 на той-жа самай вуліцы выказалі сваю салідарнасьць прадстаўнікам апазыцыі й дапамаглі ім у навядзеньні парадку, папрацаваўшы пад бел-чырвона-белым сьцягам...

Адказны за двухбаковую сувязь з грамадзтвам Андрусь ВАЯР

Ці ня тое самае гэта вогнішча...

У Магілёўскім дзяржуніверсітэце ўрачыста адчыніўся факультэт замежных моваў. Безумоўна добра, што цяпер больш людзей у нас станецъ дыпляманаванымі носьбітамі моваў, якія адчыняюць шляхі ў цывілізаванае грамадзтва.

Але вось што ня можа не засмуціць. Новы Факультэт створаны на месцы адпаведнага аддзяленьня унівэрсітэцкага філфака, на якім студэнты вывучалі замежныя мовы разам зь беларускай. Спэцыяльнасьць так і называлася: «выкладчык замежнай і беларускай мовы». Пераведўшы навучальны працэс на новы ўзровень, кіраўніцтва вырашыла, што беларуская мова больш неактуальная. Цяжка патлумачыць падобны стан чымсьці іншым, як ганебным стаўленьнем да роднай мовы і наогул нацыянальнай культуры. Павяргае ў шок гэтая гатоўнасьць выкладчыкаў і адміністратараў вышэйшай навучальнай установы служыць «новаму курсу». Як калісьці шок выклікалі, напрыклад, вогнішчы з кнігаў. Гэта падзеі ці не аднаго кшталту.

С.С.

Бадзяга – магілёўскі моладзевы часопіс
№ 1 (1)
Галоўны рэдактар: Алесь ПАЛТАРАЦКІ
Мастацкае аздабленьне: Вольга ФЕДАРАВА
Рэдакцыя: Алесь Палтарацкі, Андрусь Дзьвігун, Дзяніс Башкіраў, Вольга Федарава

ПАДАРОЖНЫЯ НАТАТКІ

У новых рыцараў адна Дама сэрца – родная краіна

У мінулым нумары «ТМ» наш карэспандэнт друкаваў нататку аб наведаньні разам з групай сябраў магілёўскага згуртаваньня моладзі «Патрыёты Бацькаўшчыны. Рух у Эўропу» Наваполацку на запрашэньне мясцовага культуровага аб'яднаньня «Княжыч» ды рыцарскага клюбу «Жалезны воўк». Сёньня, як і было абяцана, Дзяніс Новікаў працягвае дзяліцца ўражаньнямі ад паездкі.



Шлях наш пачаўся а шостай раніцы ад станцыі Магілеў-І. Але дзевяць гадзінаў дарогі не былі сумнымі, за вокнамі вагона ўвесь час мяняліся пэйзажы, час ад часу цягнік спыняўся на станцыях зь вядомымі назовамі маленькіх невядомых гарадкоў... Мы прыехалі на месца днём. Полацак сустрэў нас даволі прахалодным надвор'ем і клубамі пылу, якія вецер насіў па пустой прывакзальнай плошчы. Але нас чакала цяпло сустрэчы зь сябрамі. Ведаючы гэта, мы накіраваліся да месца сустрэчы, аб якім дамовіліся загадзя: ля помніка былому правадыру сусьветнага пралетарыяту, які, пафарбаваны чамусьці ў жоўты колер, адзінока тырчаў на плошчы. Каля яго нас сустрэла «княжычка» Рыта. Зь ёй мы рушылі ў Наваполацак, які знаходзіцца на адлегласьці шасьці кілямэтраў ад старажытнага Полацку.

Першы з будынкаў, які прыняў магілёўцаў, была так званая «бастылія». Менавіта так студэнты празвалі адзін з інтэрнатаў. Сапраўды, унутраная планіроўка будынка, магчыма, нечым нагадвае знакамітую ў сьвеце францускую турму. Аднак для нас тое было месцам маленькага адпачынку пасьля дарогі і частаваньня.

За гаворкай даведаліся падрабязьней пра аб'яднаньне «Княжыч». Яго ўтварылі настаўнікі, пазьней прыйшлі студэнты. Сябры аб'яднаньня займаюцца найперш вывучэньнем мясцовай гісторыі ды зборам самых розных матэрыялаў і сьведчаньняў далёкіх і ня вельмі часоў. Асабліва цікавіць моладзь беларускі музычны і сьпеўны фальклёр. Ад гэтага захапленьня прыйшло іншае: самастойны выраб старадаўніх народных музычных інструмэнтаў. Наш новы сябар Сяргей, напрыклад, сам зрабіў беларускую дуду, на якой вывучыўся граць, а дзяўчаты пад яе прыгожа сьпяваюць...

Аднак-жа вернемся ў сам Полацак. Першым аб'ектам, які ўсе мы хацелі хутчэй пабачыць, была, натуральна, старажытная Полацкая Сафія. Мы былі ўражаныя перад ёю. А наш Алесь Асіпцоў нават не ўстрымаўся, каб не заўважыць услых: калі стаіш перад Сафіяй, на гэтай старажытнай зямлі, адчуваеш сябе такім маленькім... Сапраўды, гэта так і ёсьць. Але адчуваеш пры гэтым не прыніжанасьць, а велічнасьць і ўзьнятасьць. Сафія стаіць на самым высокім пагорку горада і таму бачная здалёк і з усіх бакоў. Яна захавалася да нашага часу, хаця многія гады яе зьнішчалі, разбуралі. Сафія, мо як і народ, паўставала зноў і зноў. І вось мы маем шчасьлівую магчымасьць бачыць яе, пастаяць каля яе, палюбавацца ёю. Амаль натуральна адчуваеш зьвязку часоў, нібы пераходзіш з аднае эпохі ў іншую...

Непадалёк ад Сафіі знаходзіцца Калегіюм Езуітаў. Нажаль, зараз будынак далёка ня ў лепшым стане. Нам паведамілі, што за яго доўгі час ідуць спрэчкі: усё вырашаюць, каму ён мусіць належыць – культуры, адукацыі ці царкве. А тым часам будынак без гаспадара гіне на вачах.

Ўратаваць яго маюць намер сябры мясцовага рыцарскага клюба «Жалезны воўк». Зрабіць гэта хлопцы імкнуцца праз грамадзкую думку і друк. Хаця, як нам падалося, маглі б выйсьці і на рыцарскі турнір за захаваньне роднай спадчыны. Хлопцы нядрэнна экіпаваны і «узброены». Яны самі вырабляюць кальчугу, шлемы, арбалеты, мечы, лукі са стрэламі. Усё гэта мы мелі магчымасьць прыладзіць на сабе. Спадабалася! Тым больш, што ў рыцараў клюба, як і належыць, у кожнага ёсьць Дама сэрца. За іх полацкія рыцары мужна спаборнічалі на нядаўнім турніры ў Чэхіі, куды былі запрошаны са сваёй вядомасьці. Засталося толькі па-добраму пазайздросьціць сваім новым сябрам ды спадзявацца на тое, што нас запросяць на тэатралізаванае відовішча, якое зараз рыхтуе клюб «Жалезны Воўк».

...Насьпяваў час разьвітаньня. Пасьля сяброўскай вячэры, яшчэ раз азірнуўшыся на Сафію, мы пасьпяшаліся на вакзал. Па дарозе дадому зазірнулі на кароткі час у Віцебск і Воршу. Магчыма, пасьля полацкіх уражаньняў ніякага асаблівага адбітку ў душы гэтыя гарады не пакінулі. А Ворша дык асабліва засмуціла няветлівасьцю і негасьціннасьцю. На аўтавакзале талчэя народу, недахоп квітковых вакенцаў, адсутнасьць інфармацыі для пасажыраў... Ледзь зьехалі.

Родны горад сустрэў нас цяплом і чысьцінёй. На душы сталася крыху ўтульней, тым больш, што нецярпліва нагадваў пра сябе фотаапарат, у якім засталіся адбіткі полацкіх краявідаў і прыемных постацяў новых сябраў.

Дзяніс НОВІКАЎ



Пасажыру ў дарогу ці студэнту на сумную лекцыю

Заканчэньне. Пачатак у «ТМ»№№ 4, 10, 15,16.

Гульня V.

Двубой

Гуляюць двое.

Першы задумвае і запісвае слова (патрабаваньні тыя-ж: назоўнік у назоўным склоне адзіночнага ліку не памяншальнай формы і ня ймя ўласнае), не паказваючы яго партнэру, але называючы колькасьць літараў. Другі называе слова з такой-жа колькасьцю літараў, пасьля чаго задуманае слова адкрываецца і падлічваецца колькасьць супадзеньняў літар. Напрыклад, першы задумаў: дарога. Другі назваў: нэктар. Дзьве літары (**а** і **р**) тут супалі, чатыры не супалі (другой літары **а** ў слове «нэктар» няма). Першы запісвае сабе 4 балы, другі – 2. І мяняюцца ролямі: другі задумвае слова, першы адгадвае. І так – пяць разоў. Пасьля чаго па суме балаў вызначаецца пераможца.

Зноў жа – апостраф за літару ня лічыцца, а літары **е** і **ё** лічацца рознымі літарамі. Ёсьць шмат варыянтаў «Двубою». Напрыклад, кожнай літары можа быць прысвоена лікавае значэньне адпаведна частотнасьці яе выкарыстаньня (магчымы варыянт: а – 1, б – 8, в – 6, г – 8, д – 8, е – 6, ё – 10, ж – 10, з – 7, і – 3, й – 10, к – 5, л – 7, м – 5, н – 2, о – 5, п – 8, р – 4, с – 3, т – 4, у – 6, ў – 9, ф – 10, х – 10, ц – 5, ч – 9, ш – 10, ы – 4, ь – 9, э – 10, ю – 10, я – 4; іншы варыянт – па нумары літары ў альфабэце нам падаецца менш удалым). І тады ў пададзеным вышэй прыкладзе першы атрымаў бы 22 балы за няўгаданыя супернікам літары д, а, о, г; другі – 5 балаў за ўгаданыя літары а, р. Падлікі тут становяцца крыху больш складанымі, і той, хто лянуецца лічыць, выбярэ асноўны варыянт, – па колькасьці літар.

Прыемных вам хвілін за гульнёй!

Увага! «Двубоем» мы закончылі знаёмства з гульнямі, якія дапамагаюць упрыгожыць вольны час і паглыбіць валоданьне мовай. «ТМ» пры дапамозе Таварыства беларускай мовы й асацыяцыі «Кола сяброў» мяркуе правесьці летам спартакіяду па гэтых гульнях. Трэніруйцеся! Вы атрымаеце магчымасьць зарабіць грошы ўласным розумам.

М.БУЛАВАЦКІ,
былы студэнт

РЭХА НЯДАЎНЯГА РАЗЬВІТАНЬНЯ З ДОБРЫМ ЧАЛАВЕКАМ

Цёплы ліст з Украіны: Шаталаў – пра Раманькову

Вядомы данецкі настаўнік Віктар Фёдаравіч Шаталаў (старэйшыя ўспомняць колішнія знакамітыя «Астанкінскія сустрэчы») адгукнуўся на паведамленьне аб сьмерці Т.Раманьковай («ТМ» ад 4 сакавіка) цёплым лістом. Як нам думаецца, сэрца кожнага магілёўца цешаць новыя доказы высокай чалавечай годнасьці, грамадзянскай адданасьці і бескарысьлівасьці іх землякоў. Таму мы вырашылі азнаёміць зь лістом чытачоў «ТМ». Вось ён:

«Амаль адначасова з Вашым паведамленьнем аб сьмерці Тамары Амяльянаўны я атрымаў газэту з нэкралёгам (*памёр на 84-м годзе жыцьця вядомы расейскі пэдагог-публіцыст Барыс Паўлавіч Нікіцін, аўтар шматлікіх кніг аб выхаваньні дзяцей у сям'і; самая знакамітая зь яго кніг – «Мы и наши дети» – аўт.*). Пра Барыса Паўлавіча размова асобная, яна будзе працягвацца ў артыкулах і кнігах шматлікіх аўтараў дзясяткі гадоў. Па праву.

Іншая справа – Тамара Амяльянаўна. З тысячамі людзей мела яна кантакты, пакідаючы ў іх памяці вобраз няўрымсьлівай, спагадлівай і шчырай натуры, гатовай і на нягоды і на подзьвігі дзеля ажыцьцяўленьня ідэяў, у якія верыла і якія струменіла сама. Яе маленькая кватэрка была заўсёды адкрытай для ўсіх, хто меў патрэбу ў чалавечай спагадзе ці ў даху над галавой. І няхай калідор і закуткі ад падлогі да столі былі завалены паходнымі палаткамі, заплечнікамі, спальнымі мяшкамі, кацялкамі і кедамі, у яе кватэры ўсім было спакойна і ўтульна (*сам Віктар Фёдаравіч не адзін раз гасьцяваў у Т.Раманьковай; пра арганізаваны ёю цыкль лекцый В.Шаталава ў Магілёўскай мэдвучэльні «ТМ» мае намер расказаць чытачам крыху пазьней, бо гэта была прыкметная і шумная падзея ў горадзе – аўт.*).

Выбухная і ранімая, яна заўсёды была на вастрыні атакі, за што, не адзін раз бітая і зьняважаная, пакутавала, але ніколі не здавалася, не згіналася ні перад якімі прыўладнымі вараціламі... Незласьлівай і незлапамятнай, ёй, як і кожнаму з нас, былі ўласьцівыя пралікі і дробныя недахопы, але яны зь лішкам акупляліся крыштальнай бескарысьлівасьцю, апэратыўнасьцю і мэтанакіраванасьцю, уласьцівай зусім нямногім.

Хваравіта адзінокая і ранімая, яна была шчодрай на высокія ацэнкі дзеяньняў сваіх паплечнікаў і яны плацілі ёй за гэта сардэчнай чалавечай удзячнасьцю. На сэмінарах і зборах яна была ядром кандэнсацыі, той самай жывінкай, безь якой немагчымае ніякае пачынаньне. Настойлівасьці і перакананасьці ў Тамары Амяльянаўны хапала для ўсіх, і немагчыма ня верыць у шчыры боль тых, хто даведаецца аб яе сьмерці з маіх пісьмаў.

22.03.1999 г. В.ШАТАЛАЎ»

(Публікацыю падрыхтаваў Міхась БУЛАВАЦКІ)


Рэдактар Генадзь СУДНІК

Тыднёвік Магілёўскі

Аналітычна-інфармацыйная газэта, заснаваная Магілёўскай гарадзкой асацыяцыяй «КОЛА СЯБРОЎ».

Зарэгістраваная ў Дзяржкамітэце РБ па друку за № 831.

Газэта выходзіць штачацьвер.



АДРАС РЭДАКЦЫІ:

212030, г. Магілёў, вул. Першамайская, 6-22.



Тэлефон: 31-04-15,

Тэл./факс: 22-97-82,

E-mail: krug@user.unibel.by

Газэта надрукаваная афсэтным спосабам у Магілёўскай абласной друкарні імя Я.Свярдлова. Замова 17. Наклад 500 асобнікаў.